

«РЭЦЭПТ» ШКОЛЬНАГА ШЧАСЦЯ

ЧЫРВОНКА

ЗВАРШЧЫЦЫ БРУДУ НЕ БАЯЦЦА!

ЧЫРВОНКА



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

21 ЛІСТАПАДА 2019 г. ЧАЦВЕР № 221 (29088)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Віктар СІДАРОВІЧ, дырэктар Дэпартамента дзяржаўнай інспекцыі працы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Беларусі:**

*«Паводле статыстыкі, з году ў год па чарзе пераважаюць няшчасныя выпадкі то па віне наймальніка, то па віне самога работніка. Часам мне здаецца, што людзі самі сталі страчваць пачуццё самазахавання. Словам, калі работнік будзе выконваць свае службовыя інструкцыі, выконваць тэхніку бяспекі, а наймальнік — даваць усё неабходнае для захавання жыцця і здароўя людзей, тады будзе парадак. У нашай краіне створаны ўсе ўмовы ў часткі заканадаўства — прабуксоўка на стадыі рэалізацыі ў арганізацыях».*

# ПРЫСТАНЬ ДЛЯ МУЗЕЯ



Фота БелТА.

Плітачнік Юрый КСЕНАФОНТАЎ працуе на будаўніцтве набярэжнай.

**У Нацыянальным парку «Прыпяцкі» ўзводзяць цікавы аб'ект: музей пад адкрытым небам. Каб размясціць яго экспанаты і зрабіць зручным прыпынак цеплаходаў на Прыпяці, трэба пашырыць канал ад ракі да пляцоўкі музея каля аграгарадка Ляскавічы, намыць сотні тон пяску пад музейную пляцоўку, умацаваць берагі канала і ўзвесці набярэжную.**
**У Ляскавічах штогод збіраецца шмат турыстаў на этна-культурны фестываль «Кліч Палесся», і музейная экспазіцыя, прысвечаная жыццю і побыту палешукоў, стане яго несумненным упрыгожаннем.**

## КОРАТКА

- **У Беларусі праходзіць другі этап рэспубліканскай патрыятычнай квэст-гульні «Па слядах Перамогі...»**
- Краіны СНД падрыхтавалі праект праграмы супрацоўніцтва па выкарыстанні атамнай энергіі да 2030 года.
- **Другая партыя знішчальнікаў Су-30СМ прыбыла ў Беларусь.**



- Кіналагічная служба беларускай мытні выявіла з пачатку года больш за 64 кг наркотыкаў.
- **Гродзенскі «Нёман» падаў заяўку на правядзенне суперфіналу Кантынентальнага кубка IIHF.**
- Забароненыя для палётаў беспілотнікаў зоны можна ўбачыць на кадастравай карце.

На шляху да Мэт

# ПРАДАЦЬ НЕЛЬГА ВЫКІНУЦЬ

### 714 тысяч тон адходаў шкла, паперы, пластыку, шын, батарэек, машыннага масла...

**Столькі прыдатнага для перапрацоўкі смецця сабралі летась беларусы. Цяпер у краіне выкарыстоўваецца прыкладна 20 % камунальных адходаў, хоць яшчэ ў 2010-м лічба была меншая больш чым удвая. Аднак праблемы якаснай сарціроўкі, захоўвання і перапрацоўкі другасных матэрыяльных рэсурсаў (ДМР), якія не трапілі ў смецце, застаюцца. Шкло, папера і пластык адпраўляюцца ў амаль 85 тысяч кантэйнераў для раздзельнага збору смецця, аднак іх усё роўна патрэбна ўдвая больш. А вывозяць асобна сабраныя адходы часта адным смеццявозам. Пра акалічнасці работы з другаснай сыравінай расказалі эксперты.**

**Адказны збор смецця: 90 % паперы, 28 % батарэек**

Айчынныя зборшчыкі і нарыхтоўшчыкі ДМР у асноўным забяспечваюць патрэбы краіны ва ўсіх відах другаснай сыравіны. Плюс да таго летась, напрыклад, экспартавалі прадукцыі на 12,5 мільёна долараў.

У Беларусі дастаткова магутнасцяў для перапрацоўкі практычна ўсіх асноўных відаў ДМР, якія збіраюцца. У краіне дзейнічае сем смеццесарціровачных заводаў і 80 ліній сарціроўкі, на якіх можна апрацаваць мільён тон адходаў. Гэта прыкладна 30 % ад аб'ёму смецця, які ствараецца ў краіне.

СТАР. 4

Спажывец

# НІЧОГА АСАБІСТАГА, ТОЛЬКІ БІЗНЕС...

### Калі вас прымусілі купіць нешта непатрэбнае, вярнуць грошы складана, але магчыма

**Усё, як у казцы: прыгожая зала, музыка, пачастункі. Абаяльныя людзі распавядаюць аб правільным харчаванні і рэкламуюць свой тавар. Я плыву ў гэтай эйфарыі ўвагі да мяне, сціплай пенсіянеркі. Я выйграла ў розыгрышы! Толькі я атрымаю велізарную зніжку на посуд, які фактычна сам гатуе. А яшчэ падарункі: вібрамасажнае крэсла і коўдру.**

**«КАЛІ МАРУДЗІЛА, МЕНЕДЖАР ЗЛАВАЎСЯ»**

Адна і тая ж гісторыя, якую пераказваюць слова ў слова розныя жанчыны. Яны трапілі на прэзентацыю тавараў і набылі іх, падпісаўшы крэдытны дагавор. Усе сцвярджаюць, што прайшлі праз нейкі гіпнатычны сеанс. Пенсіянерка з Гомеля Наталля Іванькова — адна з такіх жанчын. Кажа, некалькі дзён не магла глядзець у вочы сваім дзецям:



— Як прызнацца родным, што пры пенсіі ў 320 рублёў ты падпісаў крэдытны дагавор на 4770 рублёў? Можна купіць патрыманую іншамарку, а тут набор каструль без фірмавай упакоўкі, проста ў цэлафанавых пакунках!

СТАР. 13

ISSN 1990 - 763X

19221>

Саюзныя адносіны

## СУПРАЦОЎНІЦТВА ПА ВЫГАДНЫХ ТАРЫФАХ

Прэм'ер-міністры Беларусі і Расіі знялі не менш за палову рознагалоссяў па інтэграцыйных дарожных картах

**Па інфармацыі прэс-службы нашага ўрада, прэм'ер-міністр Сяргей РУМАС па выніках пасяджэння Савета Міністраў Саюзнай дзяржавы нагадаў, што ўсяго неабходна распрацаваць 31 дарожную карту, уключаючы больш за 700 мерапрыемстваў. Да перагавораў кіраўнікоў двух урадаў каля 40 мерапрыемстваў па дарожных картах не былі ўзгоднены дзяржорганамі. Прэм'ер-міністр Беларусі падкрэсліў, што не менш за 20 інтэграцыйных дарожных картаў па выніках саюзнага Саўміна ўжо гатовыя да падпісання.**

«Разам з тым сапраўды засталіся складаныя пытанні, па якіх нам не ўдалося знайсці развязку. Але гэта не значыць, што развязак па іх не існуе», — адзначыў Сяргей Румас. Ён паведаміў, што прэм'ер-міністры далі дадатковыя даручэнні дзяржорганам прапрацаваць гэтыя развязкі.

«Напрыклад, калі па адчувальных для Беларусі картах — па рынку газу або па нафтавым рынку — былі чатыры неўрэгуляваныя пытанні, то сёння іх засталося два, — паведаміў кіраўнік беларускага ўрада. — Разам з тым яны складаныя і, напэўна, па іх кіраўнікамі дзяржаў будуць прапанаваны развязкі. Мы сёння вельмі значна прасунуліся і выразна разумеем, дзе ў нас засталіся разыходжанні. Узялі прыкладна тыдзень тэрміну, каб іх яшчэ раз абмеркаваць, а далей гэты пакет дакументаў з рознымі пазіцыямі бакоў будзе ўнесены на разгляд кіраўнікоў дзяржаў».

Таксама Сяргей Румас падкрэсліў, што вынікі беларуска-расійскай інтэграцыі відавочныя і бясспрэчныя. У якасці пацвярджэння сваіх слоў ён назваў роўныя правы грамадзян Беларусі і Расіі, адзіную міграцыйную прастору, адсутнасць пагранічнага кантролю.

У сваю чаргу прэм'ер-міністр Расіі Дзмітрый Мядзведзеў не выключыў, што кіраўнікам урадаў Беларусі і Расіі спатрэбіцца яшчэ раз правесці перагаворы па інтэграцыйных дарожных картах да сустрэчы прэзідэнтаў дзвюх краін.

Расійскі прэм'ер-міністр растлумачыў, што некаторыя з рознагалоссяў, якія захоўваюцца, носяць чыста тэхнічны характар, а некаторыя датычацца досыць сур'ёзных пытанняў, якія можна будзе ўрэгуляваць у фармаце абмеркавання кіраўнікамі дзяржаў з удзелам урадаў.

### РОЎМІНГ ПА СПРАВЯДЛІВАСЦІ

**Беларусь на чарговым пасяджэнні Савета Еўразійскай эканамічнай камісіі прадставіў намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Ігар ПЕТРЫШЭНКА. На пасяджэнні абмеркавана больш за 30 пытанняў са сфер знешнегандлёвай, фінансавай, прамысловай, інтэграцыйнай палітыкі, мытнага, тарыфнага і тэхнічнага рэгулявання, лічбавізацыі эканомікі.**

Як паведамляе прэс-служба ЕЭК, Савет даручыў Калегіі камісіі сумесна з дзяржавамі-членамі да 1 сакавіка 2020 года сфарміраваць з улікам пазіцый, прадстаўленых дзяржавамі ЕАЭС, прапановы па стварэнні ўмоў для ўкаранення справядлівых тарыфаў у міжнародным роўмінгу на тэрыторыях краін саюза.

Напярэдадні калегія ЕЭК абмеркавала магчымасць зніжэння тарыфаў на паслугі мабільнай сувязі ў роўмінгу паміж краінамі Еўразійскага эканамічнага саюза. Задача зніжэння платы за паслугі мабільнай сувязі ў роўмінгу на тэрыторыі ЕАЭС была пастаўлена на пасяджэнні Еўразійскага міжурадавага савета ў кастрычніку.

Для вырашэння пытанняў зніжэння платы за роўмінг спатрэбіцца зрабіць шэраг крокаў. У прыватнасці, неабходна лібералізаваць міжаператарскае ўзаемадзеянне краін ЕАЭС, мінімізаваць рызыкі ў сувязі з выпадкамі махлярства і падмены трафіку, знізіць кошт паслугі інтэркaнекту.

**Варвара МАРОЗАВА.**

Думкі ўслых

# ЕЎРАПЕЙСКІЯ ДРАНІКІ

Нязграбны вопыт замежнага «майстар-класа» на беларускай палітычнай «кухні»

**Восень — багатая, вельмі прыгожая пара года. Час упарадкаваць ураджай на палетках і падводзіць вынікі. Для гаспадарлівых беларусаў так было спрадвеку. Сёлетняя восень апроч усяго іншага песціла небывалай цеплынёй. Няхай кажуць пра глабальныя змены клімату, аднак неяк так не хочацца не тое што халадэчы, а больш слотнага «каля нуля». Усё ж лепш сонца і рознакаляровая лістота. Настрой яны ствараюць адпаведны.**

Бадай што ў многіх такое святочнае адчуванне панавала ў душы і ў мінулыя выхадныя, ці не апошні ўтульны ўік-энд перад амаль паўгадавым выпрабаваннем «нябеснай канцылярыяй». З такім настроем, ведаю, многія прыйшлі на свае выбарчыя ўчасткі. Галасаваць за «свайго» кандыдата ў дэпутаты. Не за абстрактнага адасобленага заканадаўцу, а канкрэтнага чалавека, які мае ў сваёй жыццёвай скарбонцы добрыя справы, зробленыя для людзей. Менавіта такім чынам і стварaецца каманда прафесіяналаў, здольная адлюстраваць грамадства, а значыць дзейнічаць у яго інтарэсах. І гэта зусім не высокія матэрыі, а практычны, эфектыўны падыход да справы, які мае на ўвазе канкрэтныя вынікі.

Тут усё проста. Як заўважыла спецыяльны каардынатар і кіраўнік кароткатэрміновай місіі назіральнікаў АБСЕ Маргарэта Седэрфельт, «легітымнасць не гарантуецца міжнароднай арганізацыяй, яна гарантуецца самім народам, народам Беларусі, не намі». Яна асабліва падкрэсліла, што «Беларусь з'яўляецца дзяржавай — членам АБСЕ». Са спадарыняй Седэрфельт салідарны і прадстаўнік Парламенцкай асамблеі Савета Еўропы. «Мы не можам выносіць меркаванні ў дачыненні да легітымнасці абраных кандыдатаў. Гэта вырашае народ Рэспублікі Беларусь», — адзначыў у сваю чаргу кіраўнік дэлегацыі ПАСЕ Лорд Бленкатра. Па-мойму, вельмі паказальныя выказванні, якія пераважваюць усё тое, што было сказана еўрапейскімі назіральнікамі ў дачыненні да вынікаў парламенцкіх выбараў у нашай краіне. Іх вы, напэўна, ведаеце — рыторыка з гадамі не змяняецца. Аднак змяняемся мы, і гэта радуе. Афіцыйныя каментары не прымусілі сябе чакаць, іх узважаны, упэўнены тон выклікае павагу.

«Беларускі бок азнаёміўся з заявамі міжнародных назіральніцкіх місій па выніках мінулых парламенцкіх выбараў у Беларусі. Прынята таксама да ведама заява Еўрапейскай службы знешніх дзеянняў па азначаным пытанні. У гэтай сувязі хацелі б нагадаць, што не існуе ідэальных выбарчых сістэм, пры жаданні можна знайсці заганы ў любым выбарчым працэсе ў любой краіне на прасторы АБСЕ, — адзначаецца ў заяве прэс-сакратара МЗС Беларусі Анатоля Глаза. — Беларусь праявіла максімальную транспарэнтнасць і запрасіла на выбары, якія прайшлі, рэкордную колькасць міжнародных назіральнікаў. Паводле ацэнак многіх з іх, выбарчая кампанія прайшла спакойна, арганізавана, адкрыта, публічна і на канкурэнтнай аснове, у поўнай адпаведнасці з нацыянальным заканадаўствам і нашымі міжнароднымі абавязальніцтвамі, што пацвярджаецца, у прыватнасці, заявамі місій СНД і ШАС.

Шкадуем, што місіі АБСЕ, як і ў ранейшыя гады, не ўдалося цалкам адысці ад палітызаваных ацэнак і высноў. Лічым таксама, што асабістая ангажаванасць і суб'ектыўны падыход не павінны ляжаць у аснове высноў і ацэнак міжнародных назіральнікаў. Што ў гэтым выпадку можна чакаць ад кіраўнікоў назіральных місій, якія яшчэ да прыезду ў краіну негатыўна выказваюцца пра Беларусь і публікуюць абразлівыя артыкулы пра краіну? Гэта, дарэчы, — сур'ёзнае пытанне да структур АБСЕ, якія ажыццяўляюць падбор адпаведных персаналій.

Мы неадназначна казалі нашым заходнім партнёрам, што гатовыя да канструктыўнай крытыкі, але ніколі не прымем беспадстаўнае і татальнае шальмаванне, а нашы выбарчыя працэдуры і заканадаўства калі і будуць удасканальвацца, то не па чыёйсьці ўказцы, а па запытах нашага грамадства і эвалюцыйным шляхам. Мы праводзім выбары для сваёй краіны і народа, а не каб дагадзіць знешнім сілам.

Беларусь гатовая да далейшага развіцця канструктыўнага ўзаемадзеяння ў сферах узаемнай цікавасці з усімі нашымі міжнароднымі партнёрамі. Толькі дыялог і супрацоўніцтва, а не ціск, шантаж і санкцыі дазволяць рухацца наперад па пытаннях, якія адпавядаюць інтарэсам як самой Беларусі, так і нашых партнёраў».

Гатовы падпісацца пад кожным словам прэс-сакратара нашага знешнепалітычнага ведамства, як, напэўна, многія з вас. Ацэнкі павінны быць аб'ектыўныя, у гэтым іх асноўны сэнс. Нас яшчэ са школы да гэтага прывучылі. Кіраўнік Цэнтрвыбаркама Беларусі Лідзія Ярмошына заявіла РІА «Навіны», што агучаная назіральнікамі АБСЕ папярэдняя ацэнка выбараў у беларускі парламент з'яўляецца павярхоўнай, аднабаковай і недастаткова аргументаванай. «Ёй не хапае аргументацыі», — канстатавала кіраўнік ЦВК.

«А што вы чакалі ад назіральнікаў ад АБСЕ? Яны кажуць тое, што яны кажуць ва ўсіх краінах СНД. І ўсё, што не адпавядае іх уяўленню пра жыццё, іх светаадчуванню, яно, так бы мовіць, іх расчароўвае», — выказаў журналістам сваё меркаванне дзяржсакратар Саюзнай дзяржавы Рыгор Рапота ў Маскве падчас экспертна-медыйнага форуму «Саюзная дзяржава 2030 — траекторыя будучыні», адказваючы на пытанне аб ацэнцы назіральнікамі ад АБСЕ выніkaў парламенцкіх выбараў у Беларусі.

Выстаўляць такія ацэнкі — гэта, мабыць, тое ж самае, як прыехаць у Беларусь са сваімі дранікамі. Атрымаецца прынамсі смешна. Тым больш што на ўзаемаадносіны, якія выстройваюцца апошнім часам паміж нашай дзяржавай і краінамі Старога Свету (у прыватнасці, пазітыўнае супрацоўніцтва апошніх трох гадоў згадваецца ў заяве знешнепалітычнай службы Еўрасаюза) палітызаваныя, неаргументаваныя ацэнкі наўрад ці паўплываюць. Такую думку выказаў шэраг замежных экспертаў. Беларусь адыгрывае важную геапалітычную ролю ў Еўропе — гэтым тлумачыцца такая вялікая колькасць міжнародных назіральнікаў на парламенцкіх выбарах. Такое меркаванне БелТА выказаў саветнік па пытаннях палітыкі Еўрапарламента, незалежны назіральнік Грэгары Жульен. На думку эксперта, у цэлым у яго склалася добрае ўражанне ад правядзення выбарчай кампаніі.

Так што запрашаем усіх на дранікі!

**Міхась ДУНЬКО.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Швецыя закрыла справу супраць Джуліяна Асанжа

Абвінавачванні ў сексуальным гвалце, вылучаныя ў Швецыі супраць сузаснавальніка сайта WikiLeaks Джуліяна Асанжа, знятыя. Шведская пракуратура спыніла расследаванне, распачатае ў 2010 годзе. 48-гадовы актывіст, які апублікаваў на сайце ўцечак WikiLeaks мільёны засакрэчаных урадавых дакументаў ЗША, Брытаніі і іншых дзяржаў, матэрыялы пра вайну ў Іраку і дыпламатычную перапіску вядучых сусветных дзяржаў, цяпер знаходзіцца ў лонданскай турме Бельмарш. Першапачатковa абвінавачванні супраць Асанжа ў згвалтаванні былі высунуты дзвюма жанчынамі ў 2010 годзе ў Швецыі. Неўзабаве следства было спынена, але праз некаторы час ізноў адкрыта. Тэрмін даўнасці па гэтай справе скончыўся ў жніўні 2019 года.

### Барыс Джонсан перамог на першых тэледэбатах

У Вялікабрытаніі прайшлі першыя перадвыбарчыя тэледэбаты паміж галоўнымі сапернікамі на маючым адбыцца 12 снежня галасаванні — дзеючым прэм'ерам Барысам Джонсанам і лідарам лейбарыстаў Джэрэмі Корбінам. Перамогу атрымаў дзеючы прэм'ер. На яго бок устаў 51 працэнт людзей, якія назіралі гэты раўнд, Корбіна падтрымалі 49 працэнтаў гледачоў. Такія звесткі прыводзіць сацыялагічная служба YouGov. У апытанні ўзяло ўдзел больш за 1,6 тысячы чалавек, пры гэтым варыянт адказу «не ведаю» ўдзельнікам апытання не прапаноўваўся. Джонсану сапраўды ўдалося перахапіць ініцыятыву на дэбатах, бо ён больш казаў пра Brexit, Корбін жа засяродзіўся на негатыўных аспектах праўлення кансерватараў. Аднак, як адзначае The Guardian, яркіх заяў у палеміцы абодвух палітыкаў было мала. «Па праўдзе кажучы, гэтая дыскусія не пахіснула многіх выбаршчыкаў. Абодва гулялі на сваіх моцных баках», — адзначае CNN. Дарэчы, палітыкі ў асноўным адказвалі на пытанні мадэратара дыскусіі, пазбягаючы прамога дыялогу паміж сабой, што ў цэлым адлюстроўвае ўнутрыпалітычнае становішча ў Вялікабрытаніі. У цяперашняй выбарчай кампаніі ўдзельнічаюць кіруючая Кансерватыўная партыя Джонсана, лейбарысты Корбіна, ліберал-дэмакраты Джо Суінсана, «зялёныя» Джонатана Бартлі і нацыяналістычная партыя Brexit Найджэла Фараджа.



### У Перу знайшлі больш за 140 новых гіганцкіх каменных малюнкаў

На плата Наска ў паўднёвай частцы Перу, дзе знаходзяцца самыя вядомыя ў свеце гіганцкія каменныя малюнкі, выяўлены 143 новыя геогліфы, якія адлюстроўваюць людзей, жывёл і іншых жывых істот. Разглядзець іх можна толькі з паветра. Сярод знойдзенага ёсць выявы птушак, малпаў, рыб, змей, ліс, катоў і лам. Усе яны былі зроблены шляхам выемкі верхняга пласта грунту — чорных камянёў, пад якімі знаходзіцца светлы пясок. Ён прачэрчвае на цёмнай зямлі добра адрозныя лініі, аднак з часам большасць з іх таксама пацямнела. Памеры пераважнай часткі знойдзеных малюнкаў складаюць ад піці да паўсотні метраў, самы вялікі геогліф раскінуўся ў даўжыню больш чым на 100 метраў. Адкрыццё зрабіла каманда навукоўцаў з Ямацкага ўніверсітэта ў Японіі, вывучыўшы спадарожнікавыя здымкі і правёўшы падрабязную лазерную аэрафотаздымку гэтай мясцовасці, а па яе выніках — серыю палявых работ. Адзін з малюнкаў быў убачаны толькі ў 2019 годзе пры дапамозе штучнага інтэлекту, які склаў разам разрозненыя фрагменты ліній. Узрост геогліфаў ацэньваецца сама меней у 1700—2100 гадоў. Гэта пацвярджае гіпотэзу пра тое, што іх стварылі прадстаўнікі старажытнай цывілізацыі наска або нават іх папярэднікі з культуры паракас.

Разумныя грошы

# Нашым гасцям пакупкі абыдуцца на 15—20 % танней

**З 12 лістапада гэтага года для зручнасці замежных грамадзян унітарнае прадпрыемства «Белмытсэрвіс» арганізавала выплату па сістэме TAX FREE наяўнымі грашовымі сродкамі праз краму бяспошліннага гандлю MarketLiga Duty Free. Магазін размешчаны ў Нацыянальным аэрапорце сталіцы і працуе кругласутачна сем дзён на тыдзень.**

Непасрэдна ў Нацыянальным аэрапорце Мінск для афармлення чэка на вяртанне гэтых сум па такой сістэме мытныя органы рэкамендуюць зарэзерваваць 15—20 хвілін. Пры вывазе тавараў у багажы авіяпасажырам да здачы апошняга неабходна запрасіць па тэлефоне супрацоўнікаў мытных органаў для праходжання мытнага кантролю ў першым сектары вылету каля месца здачы негабарытнага багажу. У тым выпадку, калі тавары вывозяцца ў ручной паклажы, пры праходжанні мытнага кантролю неабходна прайсці ў «чырвоны» калідор. Супрацоўнікі мытных органаў ідэнтыфікуюць тавар, звераць яго з прадстаўленымі дакументамі і ўнясуць неабходныя адзнакі ў чэкі, а таксама раскажуць, куды трэба звярнуцца для вяртання сродкаў у рамках сістэмы Tax Free.

Эксперты мытнага сэрвісу тлумачаць, што паслуга Tax Free дазваляе сэканоміць на пакупках, зробленых у крамах нашай краіны, нерэзідэнтам ЕАЭС. Згаданая паслуга прадугледжвае вяртанне 15 % ад сумы пакупкі без ПДВ, акрамя таго, распаўсюджваецца на ўсе тавары, якія абкладаюцца такім падаткам па стаўцы 20 %, і даступная пры куплі на суму больш за 80 рублёў на працягу аднаго дня ў адной краме — удзельніку праграмы Tax Free.

Вяртаецца падатак наяўнымі грашыма толькі ў беларускіх рублях. Для гэтага пасля праходжання мытнага кантролю ў зоне вылету ўсе ахвотныя могуць звярнуцца да спецыяліста «Белмытсэрвіса» альбо да работніка крамы бяспошліннага гандлю «Аэрапорт Мінск» ТАА «МаркетЛіга» (Duty Free). Таксама вяртанне наяўнымі можна ажыццявіць праз аддзяленні Беларусбанка, размешчаныя ў пунктах пропуску на мяжы з Польшчай (Берастравіца, Брузгі, Казловічы, Дамачава, Пясчатка, Варшаўскі мост), Літвой (Прывалка, Беняконі, Каменны Лог, Катлоўка), Латвіяй (Грыгораўшчына, Урбаны), Украінай (Новая Гута, Новая Рудня, Верхні Церабяжоў, Макраны).

Каб атрымаць перапланаваныя наяўныя, неабходна будзе прад'явіць запоўнены чэк Tax Free з касавым чэкам і мытнай пячаткай, а таксама пашпарт або іншы дакумент, які яго замяняе.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Наш фармат

# Туманны Альбіён прымае прыгажунь

**20 лістапада ў Лондане стартаваў 69-ы міжнародны конкурс прыгажосці "Міс свету — 2019". Сёлета гэты найстарэйшы і самы прэстыжны з існуючых у свеце форум збярэ ўдзельніц са 120 краін і тэрыторый — прынамсі, столькі заявак атрымалі арганізатары. Сваіх дзяўчат дэлегавалі ў тым ліку Алжыр, які не ўдзельнічаў у конкурсе больш як пятнаццаць гадоў, Віргінскія і Кайманавы астравы, Манголія, Паўночная Ірландыя, Чад і іншыя дзяржавы. Беларусь прадстаўляе мінчанка Анастасія ЛАЎРЫНЧУК — «Другая віцэ-міс Беларусі — 2018».**



instagram.com/an.laur

Беларуска за гадзіну да вылету ў Лондан.

19-гадовая трэцякурсніца Інстытута бізнесу і менеджменту тэхналогій БДУ ставіцца да ўдзелу ў конкурсе вельмі сур'ёзна: «Гэта не проста прыехаць, сябе паказаць — я ўсведамляю, што прадстаўляю краіну і маю магчымасць шырэй расказаць пра Беларусь у свеце». Таму рыхтавацца яна пачала больш чым паўгода таму — распытала папярэднюю ўдзельніцу Марыю Васілевіч пра тонкасці арганізацыі і падводныя камяні, якія могуць чакаць на конкурсе, актыўна займалася са спецыялістамі Нацыянальнай школы прыгажосці харэаграфіяй і дэфіле, узмацніла спартыўныя трэніроўкі і нават прабегла Мінскі паўмарафон, падцягвала англійскую, рыхтавала свой дабрачынны праект, прадумвала макіяж і ўборы. Праўда, апошнія два пункты давялося перагледзець: замест Тайланда, дзе цёпла і вільготна, арганізатары перанеслі конкурс у Вялікабрытанію, таму багаж дзяўчыны пацяжэў практычна ў два разы. Усяго ў Лондан Анастасія павезла пяць чамаданаў. У іх увайшлі амаль 40 разнастайных сукенак, ад паўсядзённых да вячэрніх, 10 дызайнерскіх капялюшыкаў і 20 пар абутку, народны касцюм з галаўным уборам, сувеніры для арганізатараў і ўдзельніц (у тым ліку знакаміты беларускі зефір, касметыка, вырабы з ільну), лот для дабрачыннага аўкцыёну, беларускі сцяг і кніга пра славутасці нашай краіны і нават... шабля. З ёй дзяўчына выканае танец для намінацыі «Міс Талент». Запэўнівае, што наогул збіраецца ўдзельнічаць ва ўсіх намінацыях і актыўнасцях, каб назва Беларусі на конкурсе гучала як мага часцей.

Фінал «Міс свету — 2019» адбудзецца 14 снежня ў выставачным цэнтры ExCeL London.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

Інавацыя

# У ЛЮТЫМ НАСТУПНАГА ГОДА Ў ГАНДАЛЬ ПАСТУПІЦЬ ПЕРШЫ БЕЛАРУСКІ КАНЬЯК

## А там, глядзіш, і да мясцовага віскі пару крокаў

**Інфармацыя пра айчынны каньяк «пайшла ў народ» падчас правядзення другога Міжнароднага дэгустацыйнага конкурсу «Залаты келіх». Анансаваны на мерапрыемстве летась напой двухгадовай вытрымкі ўжо прайшоў экспертную дэгустацыю і досыць хутка паступіць у рознічны продаж.**

На конкурсе амаль ва ўсіх намінацыях была прадстаўлена інавацыйная беларуская прадукцыя. Сярод яе ўзораў — айчынны гаіст і фруктовая гарэлка. «Прарывам можна назваць вытворчасць айчыннага каньяку. Падкрэслю, што гэты напой у прамым сэнсе беларускі — сыравіна і тэхналогіі мясцовыя. Цыкл вытворчасці ад культывацыі вінаграднай лазы да разліву праходзіць у нашай краіне. Якасць беларускіх лікёра-гарэлачных вырабаў высока ацаніла экспертнае журы. У аснове гэтага ў тым ліку цеснае ўзаемадзеянне беларускай навукі і вытворцаў. Налета разлічваем здзівіць прафесійных дэгустатараў яшчэ адной навінкай — віскі прэміум-класа», — адзначыў **начальнік аддзела тэхналогій алкагольнай і безалкагольнай прадукцыі НПЦ па харчаванні НАН Беларусі Аляксандр ПУШКАР.**

Наш мясцовы каньяк мае тэрмін вытрымкі да трох гадоў, але захоўваюць яго не ў бочках. Ён настойваецца на дубовай дранцы. Тут ёсць свая рацыя: апошняя хутчэй аддае каньяку свой непаўторны вытанчаны смак. А бочак мы не робім, таму давялося б купляць іх за мяжой, і напой быў бы значна даражэйшы. Палескія вытворцы маюць 70 гектараў вінаграднікаў і ўласны яблыневы сад. Дарэчы, менавіта з яблыкаў тут робяць фруктовую гарэлку з французскай назвай кальвадос.

Міжнародны дэгустацыйны конкурс «Залаты келіх» праходзіць у Мінску другі раз. У ліку ўдзельнікаў — Беларусь, Італія, Кітай, Грузія і Малдова. Сярод прафесійных дэгустатараў быў нават пасол Ізраіля, якога прыемна здзівіла якасць нашай прадукцыі.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ЭЛІТНЫ РАЎНД ЛІГІ ЧЭМПІЁНАЎ...

**па міні-футболе стартаваў у мінскім палацы спорту «Уручча». Спаборніцтвы такога ўзроўню беларуская сталіца прымае ўпершыню.**

У стартавым матчы чэмпіён Беларусі мінская «Сталіца» прымала ўкраінскі «Херсон». Сёння мінчане згуляюць са «Спартай», а 23 лістапада завершаць турнір матчам з «Барселонай».

Склады астатніх квартэтаў элітнага раўнда кваліфікацыі Лігі чэмпіёнаў выглядаюць наступным чынам:

А — КПРФ (Масква, Расія), «Добавец» (Славенія), «Хале-Гаік» (Бельгія), «Мостар» (Боснія і Герцагавіна);

В — «Цюмень» (Расія), «Спортынг» (Лісабон, Партугалія), «Нова Врієме» (Макарска, Харватыя), «Аят» (Рудны, Казахстан);

С — «Кайрат» (Алматы, Казахстан), «Бенфіка» (Лісабон, Партугалія), «Пезара» (Італія), «Мурсія» (Іспанія).

У «Фінал чатырох» выйдуць толькі пераможцы квартэтаў. Адзначым, што беларускія клубы яшчэ ні разу не траплялі ў вырашальную стадыю гэтых спаборніцтваў. Дзеючым пераможцам Лігі чэмпіёнаў па міні-футболе з'яўляецца партугальскі «Спортынг».

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

Будзь у курсе!

# Навіны Мінюста ў Telegram



Самая важная і карысная інфармацыя пра работу судовых выканаўцаў, загсаў, таварыстваў адвакатаў, натарыусаў і медыятараў, некамерцыйных арганізацый і іншых складальнікаў сістэмы органаў юстыцыі Беларусі з 20 лістапада стала даступнай у месенджары Telegram: https://t.me/minjust_by.

У ведамстве расказалі, што тут будуць змяшчаць фота- і відэахроніку, актуальны прававы кантэнт, аператыўную і дакладную інфармацыю пра мерапрыемствы, якія Мінюст арганізуе на рэспубліканскім і міжнародным узроўнях. У рубрыцы «Пытанне/Адказ» можна будзе атрымаць экспертныя каментарыі.

**Ірына СІДАРОК.**

# ВАГА РУЧНОЙ ПАКЛАЖЫ ПАВЯЛІЧАНА

## І ўведзена брэндаваная сістэма тарыфаў на авіябілеты

**З 18 лістапада авіякампанія «Белавія» перайшла на новую сучасную структуру тарыфаў, якая дазваляе пасажырам самастойна выбіраць набор паслуг для пералёту. У рамках новай канцэпцыі перавозчык павялічыў вагу ручной паклажы з 8 да 10 кілаграмаў, паведамляе яго прэс-служба.**

У новай сістэме тарыфаў будуць даступныя безбагажныя тарыфы. Колькасць месцаў і кошт авіябілетаў у розных тарыфных брэндах вар'іруюцца ў залежнасці ад ёмістасці паветранага судна, колькасці пасажыраў на рэйсе і іншых фактараў. Розніца паміж коштам безбагажнага пералёту і мінімальным коштам білета з багажом па маршруце «туды-назад» будзе складаць да 65 еўра ў залежнасці ад напрамку.

Так, напрыклад, мінімальны кошт квітка «туды-назад» без багажу ў Калінінград будзе пачынацца ад 85 еўра, з Мінска ў Прагу кошт перавозкі «туды-назад» без багажу — ад 166 еўра, з Мінска ў Кіеў авіябілет «туды-назад» без багажу — ад 109 еўра.

Усе тарыфы авіякампаніі падзелены на пяць груп: «Прома», «Лайт», «Смарт», «Флекс» і «Бізнес».

У тарыфных брэндах «Прома» і «Лайт» прапануюцца самыя даступныя па цане авіябілеты. Абодва брэнды даюць магчымасць бясплатна перавезці толькі ручную паклажу вагой не больш за 10 кілаграмаў. Пры неабходнасці куплі дазволу на правоз багажу кошт правозу аднаго чамадана знізаны з 50 да 25 еўра для названых брэндаў.

У тарыфы групы «Смарт» ужо ўключаны бясплатны правоз не толькі аднаго месца ручной паклажы вагой да 10 кілаграмаў, але і зарэгістраванага багажу вагой да 23 кілаграмаў. Тарыфы «Смарт» таксама прадугледжваюць магчымасць бясплатнага папярэдняга выбару асобных катэгорый месцаў на борце самалёта.

Умовы тарыфу «Флекс» прадугледжваюць, акрамя бясплатнага правозу ручной паклажы, бясплатны правоз аднаго месца багажу вагой да 32 кілаграмаў. Паслугі папярэдняга выбару месца ў салоне, а таксама змены даты вылету і вяртання білета аказваюцца бясплатна.

«Бізнес» тарыф уключае ў сябе найбольшую колькасць паслуг: бясплатны правоз двух месцаў ручной паклажы вагой не больш за 10 кілаграмаў кожнае і двух месцаў зарэгістраванага багажу вагой да 32 кілаграмаў кожнае, бясплатны папярэдні выбар месца на борце і магчымасць змены і вяртання білета да і пасля вылету . Акрамя таго, авіякампанія прапануе пасажырам, якія вандруюць па тарыфе «Бізнес», прыярытэтную пасадку, абслугоўванне ў бізнес-зале і асобную стойку рэгістрацыі.

Спартыўны рыштунак перавозіцца без дадатковай аплаты згодна з дзейнымі правіламі авіякампаніі па тарыфах груп «Смарт», «Флекс» і «Бізнес».

Новыя правілы тарыфаў распаўсюджваюцца на авіябілеты, набытыя з 18 лістапада ў рамках новай тарыфнай канцэпцыі. Да квіткоў, афармленых раней, прымяняюцца правілы, якія дзейнічалі на момант пакупкі авіябілета. У той жа час новыя правілы па памерах кожнага месца ручной паклажы з 18 лістапада прымяняюцца да ўсіх авіябілетаў.

На працягу недоўгачасовага перыяду тэсціравання авіякампанія будзе ўважліва сачыць за аператыўнай ліквідацыяй магчымых памылак, з улікам атрыманага вопыту ўносіць дапаўненні і змяненні ў работу новай канцэпцыі.

У прэс-службе авіяперавозчыка таксама звярнулі ўвагу, што па безбагажных тарыфах ручную паклажу нельга будзе здаваць у багаж. У сувязі з гэтым неабходна загадзя азнаёміцца з правіламі правозу ручной паклажы, якія захоўваюцца, як і раней: забаронены правоз усіх вострых, рэжучых і колючых прадметаў, выбуховых рэчываў, сціснутых і звадкаваных газаў. У ручной паклажы дазваляецца правозіць вадкасці агульным аб'ёмам адзін літр ва ўпакоўках не больш за 100 мілілітраў. Больш падрабязную інфармацыю аб правілах правозу багажу можна знайсці ў раздзеле «Ваш багаж» на сайце belavia.by.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ПРАДАЦЬ НЕЛЬГА ВЫКІНУЦЬ



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Сфера абарачэння з ДМР, іх збор і перапрацоўка развіваюцца ў Беларусі ўстойліва і актыўна. Па некаторых відах работа была толькі пачатая, але ўжо дасягнула добрых вынікаў. У параўнанні з лічбамі 2010-га, паперы летась сабралі ў 1,6 раза больш, шкла — у 3,9 раза, палімераў — у 2,8, шын — у 2,3 раза, заўважыў **Анатоль ШАГУН, начальнік упраўлення па каардынацыі дзейнасці ў сферы абыходжання з ДМР ДУ «Аператар другасных матэрыяльных рэсурсаў»:**

— Такіх вынікаў можна дасягнуць толькі дзякуючы сістэмнай зладжанай рабоце ўсіх складальнікаў гэтай сферы, пачынаючы ад зборшчыкаў: ЖКГ, арганізацый спажыўкааперацыі, прыватных арганізацый і канчаючы перапрацоўшчыкамі. Гэтая сфера стала цікавая і бізнесу. Сіламі прыватных прадпрыемстваў, дарэчы, збіраюць больш за палову ДМР. Вынікі збору другаснай сыравіны ў Беларусі па некаторых відах перавышаюць паказчыкі нават Еўрасаюза. Сёння збіраюць каля 90 % адходаў паперы, колькасць збору шкла і матацыклетных шын набліжана да 80 %. Дастаткова поўна збіраюцца адходы маслаў у камунальным сектары (каля 75 %). Пакуль адстаём ад Еўропы па аб'ёмах збору адходаў палімераў (31 %), электрычнага і электроннага абсталявання (48 %). Хоць сістэмы збору апошніх створаны толькі чатыры гады таму, так што рост за гэты час лічбаў збору таксама значны. Вяртаецца і 28 % рэалізуемай колькасці батарэек, і гэта таксама добры паказчык, ён трымаецца выключна на свядомасці людзей, якія добраахвотна і бясплатна прыносяць батарэйкі ў спецыялізаваныя кантэйнеры. Гэта пацвярджае, што мы сёння гатовыя да адказнага збору смецця.

У кастрычніку ўрад прыняў пастанову № 715, якая зацвердзіла канцэпцыю стварэння аб'ектаў па сарціроўцы і выкарыстанні цвёрдых камунальных адходаў (ЦКА) на палігонах для іх захавання і мае на мэце пераход ад раённага ўзроўню кіравання адходамі да рэгіянальнага.

— Гэтым дакументам прадугледжаны падзел тэрыторыі краіны на 30 рэгіёнаў, у кожным з якіх павінен быць аб'ект па сарціроўцы і выкарыстанні ЦКА і збудаваны сучасны палігон для захоўвання рэштак смецця, якія выкарыстаць інакш немагчыма, — растлумачыў Анатоль Шагун.

### Здаў макулатуру — аплаціў «камуналку» за месяц

Спачатку сабраць шкло, паперу, пластык асобна, потым вывезці разам адным смеццявозам, пасля зноў адправіць на дасарціроўку. Такая сітуацыя часта паўтараецца ў сістэме работы з другаснай сыравінай, і спецыялісты заклікаюць мяняць такі падыход.

— Збіраючы розныя віды ДМР у адну ёмістасць для вывазу, мы маем патрэбу ў наступнай сарціроўцы. Падчас перавозкі якасць сыравіны таксама псуецца. Церпіць і дыскрэдытуецца ў вачах людзей праз такі падыход і сама сістэма раздзельнага збору. Грамадзяне не разумеюць і пытаюцца, навошта збіраць асобна, калі ўсё ссыпаюць у адно, — сцвярджае **Вольга САЗОНАВА, начальнік галоўнага ўпраўлення рэгулявання абыходжання з адходамі біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці Мінпрыроды.** — Кантэйнераў для асобнага збору таксама недастаткова. У пераліку на тысячу гарадскіх жыхароў сметніц патрэбна ўдвая больш, чым існуе.

Мяркуецца, што ў мэтах удасканалвання тэхнічнага боку сістэмы раздзельнага збору другаснай сыравіны ЖКГ і Мінпрыроды распрацоўць ТКП з правіламі абарачэння з адходамі. Тут дакладна трэба прапісаць агульныя падыходы да арганізацыі сістэмы збору ДМР. У тым ліку патрабаванні да таго, як наладзіць сістэму раздзельнага збору ў насельніцтва.

У краіне вядзецца работа па стварэнні пляцовак для кампасціравання арганічнага складальніка адходаў. Зацверджаны агульнадзяржаўны класіфікатар адходаў, якія ўтвараюцца ў Беларусі.

Закупкай і зборам макулатуры, шклабою, поліэтылену ў «чыстым» выглядзе ад насельніцтва займаюцца як прыватныя нарыхтоўшчыкі, так і ў Белкаапсаюзе. Купленая непасрэдна ў чалавека сыравіна значна чысцейшая і якасная, аднак у краіне ўсяго 750 стацыянарных нарыхтоўчых пунктаў і 150 перасоўных для сельскай мясцовасці, і такой колькасці недастаткова. Такім чынам насельніцтва пазбаўляюць выбару, што рабіць са сваім смеццем. У іх застаецца адзін шлях — у кантэйнеры, і добра, калі яны ёсць на пляцоўцы каля дома, упэўнена **Аксана СКІНДЭР, начальнік упраўлення нарыхтовак Беларускага рэспубліканскага саюза спажывецкіх таварыстваў «Белкаапсаюз»:**

— Каб насельніцтва збірала смецце раздзельна, яго трэба матываваць. Грашыма. Летась мы купілі ў насельніцтва 403 тысячы тон другаснай сыравіны. Людзям выгадна працаваць напрамую з прыёмна-нарыхтоўчай сеткай, бо гэта магчымасць не толькі заробку, але і кампенсацыі часткі затрат на камунальныя плацяжы. Сям'я з чатырох чалавек, якая жыве ў двухпакаёвай кватэры, збіраючы на працягу года адходы асобна, можа аплаціць за атрыманыя грошы «камуналку» за месяц. Да таго ж і якасць сабранай такім чынам сыравіны значна вышэйшая, чым у той, што з кантэйнераў. Папера не вільготная, шкло не бруднае... Тым больш што сучасныя нарыхтоўчыя пункты — гэта часовая пляцоўка, якая можа перамяшчацца па горадзе. Умоўна гэта месца з вагамі, агароджанае плотам. Сетка нарыхтоўчых пунктаў павінна быць такой жа даступнай, як і кантэйнерныя пляцоўкі.

Аксана Скіндэр раіць жыхарам самім выбіраць, што рабіць з адходамі. А на заканадаўчым узроўні — устанавіць нарматывы забяспечанасці прыёмна-нарыхтоўчымі пунктамі, як гэта зроблена пры размяшчэнні кантэйнераў для раздзельнага збору.

❍ Дарэчы

## БЕЛАЯ МАКУЛАТУРА І ЧЫСТЫ ШКЛАБОЙ — У ДЭФІЦЫЦЕ

**Так сцвярджаюць эксперты галіны другасных матэрыяльных рэсурсаў (ДМР). Хоць аб'ёмы асобнага збору штогод павялічваюцца і паперы ў краіне збіраюць ужо каля 90 %, а лічбы па шкле набліжаюцца да 80 %, але сыравіны для работы прадпрыемствам, з аднаго боку, не хапае, а з другога — не ўсё, што трапляе ў кантэйнеры, можна перапрацаваць. Сёлетні дзяржзаказ на збор другаснай сыравіны ў краіне, дарэчы, 280 тысяч тон адходаў паперы і 111 тысяч тон — шкла. Пры гэтым макулатуру прымаюць па цане 6—10 капеек за паперу і каля 15 — за кардон, а за шкло прапануюць ад 2 да 12 капеек.**

Сіламі сямі арганізацый холдынга «Белрэсурсы» ў краіне нарыхтоўваецца каля 7 % ад агульнага аб'ёму збору ДМР. З 2012-га тут наладзілі трохзменны рэжым работы па сарціроўцы змешанага шклабою. Існуе сем рэгіянальных накапляльных пляцовак ва ўсіх абласцях краіны. Аднак пры магчымай магутнасці 120 тысяч тон тут штогод працуюць з 90—95 тысячамі тон шкляной сыравіны. На айчынным рынку сёння запатрабаваны паўбелы шклабой, у невялікіх аб'ёмах — карычневы. Зялёнае і іншых колераў шкло ідзе на экспарт, за што холдынг атрымлівае каля 3,5 мільёна долараў штогод.

— Максімальныя магутнасці прадпрыемства вызначаны з улікам паступлення больш якаснай сыравіны. Аднак у большасць паставак — са смеццесарціровачных заводаў, дзе шкло забруджана прымесямі, у тым ліку арганічнымі, што, вядома, памяншае прапускную здольнасць, — расказаў **Гадад ГАЛІМАЎ, намеснік генеральнага дырэктара холдынга «Белрэсурсы».** — Рэзервы для перапрацоўкі змешанага шклабою мы маем, ніякіх абмежаванняў прыёму няма, не хапае толькі шклабою. На ўнутраным рынку ён, дарэчы, каштуе на 40 % ніжэй, чым пры яго экспарце.

Макулатуру, якой існуе ажно 13 відаў, у краіне перарабляюць 11 прадпрыемстваў, 10 з якіх аб'яднаны ў канцэрн «Беллеспаперапрам». Для шасці з іх папера — адзіны від сыравіны, з якім яны працуюць. Для работы канцэрна трэба каля 313—320 тысяч тон сыравіны. Летась у рамках дзяржзаказу яны атрымалі 274 тысячы тон.

— Мы можам вырабляць з макулатуры запатрабаваную прадукцыю, больш за 70 % якой адпраўляецца на экспарт, — кажа **Аляксандр ПШОННЫ, начальнік упраўлення цэлюлозна-папяровай і лесахімічнай вытворчасці канцэрна «Беллеспаперапрам».** — Аднак у агульным аб'ёме пастаўкі ў нас недахоп высакаякаснай макулатуры — белых відаў. 20—30 тысяч тон (або 10 % ад таго, што перарабляем) даводзіцца імпартаваць з Расіі і Еўропы.

Сумесна з ЖКГ і аператарам ДМР мы праводзім праграму па мадэрнізацыі вытворчасці, што дазволіць палепшыць якасць перапрацоўкі нізкагатунковай макулатуры. Тое, што цяпер у краіне не запатрабавана як сыравіна, таму што яго немагчыма перарабіць, — з 2020-га мусіць перастаць быць праблемай. У канцы наступнага года ў канцэрне змогуць працаваць з любой макулатурай, якая будзе збірацца на смеццеперапрацоўчых заводах і нарыхтоўчых станцыях.

**Ірына СІДАРОК, фота аўтара.**


**Извещение о повторном открытом аукционе по продаже имущества ОАО «Красносельскстройматериалы» (г. Гродно, ул. Пороховая, д. 9/1) 10 декабря 2019 года**

| | |
|---|---|
| **Вид аукциона открытый** | Лот № 1 |
| **Предмет аукциона** | Изолированное помещение с инвентарным номером 400/D-97525 (наименование – квартира № 4, назначение – квартира) общей площадью 106,4 кв. м. Число комнат – 3. Год постройки – 2008. Квартира находится на 2-м этаже 7-, 8-этажного дома. Материал стен – силикатные блоки. |
| **Начальная цена продажи** | 185 000,00 рублей |
| **Кадастровый номер земельного участка и размеры** | 440100000001005550, 0,1692 га |
| **Месторасположение земельного участка** | г. Гродно, ул. Пороховая, д. 9/1-4 |
| **Имущественное право земельного участка** | Право постоянного пользования для обслуживания многоквартирного жилого дома со встроенными нежилыми помещениями |
| **Продавец** | **Открытое акционерное общество «Красносельскстройматериалы», г. п. Красносельский, Волковысский район, Гродненская область, тел.: 8 (0152) 433406, 430467** |
| **Сумма задатка** | 18 500,00 рублей |
| **Организатор аукциона** | Коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», г. Гродно, пл. Ленина, д. 2/1, тел.: 720537, 720010 |
| **Дата проведения аукциона** | **10 декабря 2019 года** |
| **Время проведения аукциона** | 12.00 |
| **Место проведения аукциона** | **г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, актовый зал** |
| **Место приема заявлений и прилагаемых к нему документов** | г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет 407 |
| **Дата и время начала приема документов** | 18 ноября 2019 года, 8.00 |
| **Дата и время окончания приема документов** | 4 декабря 2019 года, 17.00 |

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:
– копии платежных поручений о внесении задатка за подачу заявления на расчетный счет BY24AKBB30120000418104000000 в филиале № 400 ГОУ ОАО АСБ «Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY21400, УНП 590727594, получатель – КУП по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости». **Юридическое лицо:** доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – одну копию учредительных документов. **Физическое лицо:** паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность.
Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.
В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене продажи, увеличенной на 5 процентов.
Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.
Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.
Победитель обязан возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, в течение 3 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
**Адрес сайта: www.grodno.gov.by, gcn.by**



**ООО «СпецРеализация» объявляет о проведении вторых повторных открытых торгов в форме аукциона по продаже имущества ООО «КБСТ – управляющая компания холдинга «КБСТ-Холдинг» (УНП 690595242, Минская обл., Минский р-н, Боровлянский с/с, д. Королев Стан, ул. Московская, д. 17, комн. 205), находящегося в процедуре экономической несостоятельности (банкротства).**

***Дата и время проведения торгов:* 5 декабря 2019 года**. Начало – 12.00. Заявки принимаются с 21 ноября 2019 года до 17.00 4 декабря 2019 года.

***Место проведения торгов:*** г. Минск, пр-т Победителей, 31-1, комната переговоров ОАО «Гостиница Планета».

***Организатор торгов:*** ООО «СпецРеализация» (УНП 691842036, 223060, Минская обл., Минский р-н, Новодворский с/с, д. Большое Стиклево, д. 40, корп. 2, пом. 41), тел. 8 (029) 684-71-76.

***Продавец:*** ООО «КБСТ – управляющая компания холдинга «КБСТ-Холдинг» (УНП 690595242) в лице антикризисного управляющего Частного унитарного предприятия по оказанию услуг «Управление Право Бизнес». Тел. 8 (029)6644589.

Шаг торгов – 5 %. Задаток – 5 %. Подробная информация об имуществе, условиях торгов и порядке проведения размещена на интернет-сайте ***http://bankrot.gov.by/».*** Контактный телефон +375296847176.

Сведения о предыдущих торгах: РИУ «Издательский дом «Звязда», номер газеты 155 (29022) за 17.08.2019; РИУ «Издательский дом «Звязда», номер газеты 197 (29064) за 16.10.2019.



**Внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Гомельжилпроект» состоится 03.12.2019 в 14.00.**

ПОВЕСТКА ДНЯ:

О списании просроченной дебиторской задолженности.

Местонахождение ОАО «Гомельжилпроект»: ул. Кирова, 17, г. Гомель.

Место проведения собрания: ул. Кирова, 17, г. Гомель.

Время регистрации в день проведения собрания – с 13.30 до 14.00.

При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – доверенность).

С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 25.11.2019 (с 14.00 до 16.00) по месту нахождения общества.

Наблюдательный совет.

УНП 400022625

# ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

21 ЛІСТАПАДА 2019 г.
ЧАЦВЕР
№ 20 (15875)

Выдаецца з 21 красавіка 1921 года




*Маладыя імёны*

Ліза МІСНІКАВА:

# «Быць першай — мой выклік самой сабе!»

**Ужо зусім хутка раскрыецца інтрыга дзіцячага конкурсу песні «Еўрабачанне-2019», які сёлета адбудзецца ў Глівіцэ (Польшча). Нашу краіну на ім прадставіць Ліза Міснікава з кампазіцыяй «Попельны». Выступіць дзяўчына пад сёмым нумарам. Перад ад'ездам у Польшчу мы сустрэліся з ёй, каб распытаць пра любоў да музыкі, узаемаадносіны з бацькамі і густы сучасных падлеткаў.**

## «МНЕ ПАДАБАЕЦЦА, КАЛІ ПАЗНАЮЦЬ»

***— Пасля адбору на дзіцячае «Еўрабачанне» ты паспела адчуць сябе папулярнай?***

— Паколькі ён — самы маштабны з тых конкурсаў, у якіх мне пакуль што даводзілася ўдзельнічаць, то пасля перамогі на ім я адчула не папулярнасць, а хутчэй увагу да сябе, якую назіраю ўжо працяглы час. Бо на многіх творчых спаборніцтвах усё заканчваецца ў той момант, калі табе ўручылі дыплом. Тут жа ідзе па нарастаючай: мной цікавяцца, пазнаюць. І мне гэта падабаецца.

***— Раскажы, на чым была сканцэнтравана ў апошні месяц перад паездкай у Польшчу.***

— У першую чаргу, шмат часу мы адводзілі для работы над вакалам. Тое ж самае датычылася і пастаноўкі нумара — важна было ўлічыць кожную дэталь, каб усё глядзелася прыгожа і дастойна. Нумар змяніўся, бо нешта дадавалі, змянялася харэаграфія, адбылася змена сярод удзельнікаў балета.

***— Ужо вызначылася са сваімі фаварытамі на сёлетнім конкурсе?***

— Так, я азнаёмілася з песнямі ўдзельнікаў. Спадабалася шмат кампазіцый, якія, на маю думку, у нечым падобныя. Але ўпэўнена, што кожная з іх класная і знойдзе слухача. Сярод тых, за каго я аддала б свой голас, — Мальта, Польшча, Нідэрланды і Македонія. (Нагадаем, у адпаведнасці з правіламі міжнароднага конкурсу беларусы змогуць прагаласаваць за Лізу ў інтэрнэце на афіцыйным сайце з 22 да 24 лістапада ўключна і ў дзень конкурсу. — **Аўт.**)

*(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)*

*Прафесія не для кожнага*

# «РЭЦЭПТ» ШКОЛЬНАГА ШЧАСЦЯ

Настаўнікі рады табе, вераць у твае магчымасці і давяраюць...

**Што можа зрабіць сучасную школу шчаслівай? Паразважаць на гэтую тэму прапанавалі ў рамках дыскусійнай пляцоўкі вучням профільных педагагічных класаў і груп. Яны частыя госці ў Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце імя Максіма Танка. І трэцяя міжнародная канферэнцыя «Педагагічныя класы: вопыт і перспектывы» таксама прайшла пры іх непасрэдным удзеле. Менавіта на гэтых падлеткаў сёння робяць тут стаўку.**

**— Педагогіка — прафесія не для кожнага, — разважае рэктар БДПУ Аляксандр ЖУК. — Ад таго, які абітурыент прыйдзе сёння вучыцца да нас, залежыць, які настаўнік будзе заўтра ва ўстановах адукацыі, — гэта аксіёма. Нам патрэбныя маладыя людзі з педагагічнымі схільнасцямі, з жаданнем вучыць іншых, лідарскімі якасцямі, уменнем камунікаваць і выстройваць стасункі з іншымі. Матывацыя да прафесіі — вось што, напэўна, самае важнае. Быць настаўнікам — адна з найскладанейшых задач, і добра, калі ў старшакласнікаў яшчэ ў школе ёсць магчымасць праверыць правільнасць свайго выбару. Не канстатаваць на трэцім-чацвёртым курсе, што ты памыліўся, а пераканацца ў сваіх здольнасцях і схільнасцях яшчэ падчас першых педагагічных спроб, зробленых у школе.**

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*



У рамках канферэнцыі была арганізавана выстаўка дасягненняў педагагічных класаў школ-лабараторый, дзе былі прадстаўлены найлепшыя партфоліа, даследчыя, творчыя работы, а таксама відэаматэрыялы і публікацыі.

*Нечакана!*

# ЗВАРШЧЫЦЫ БРУДУ НЕ БАЯЦЦА!

Як і фізічных нагрузак

**Напэўна, ужо не існуе такой сферы дзейнасці, у якой не змагла б рэалізаваць сябе сучасная жанчына. Аднак ёсць прафесіі, дзе іх да гэтага часу не вельмі звыкла бачыць. Мы пагутарылі з 32-гадовай электразваршчыцай чацвёртага разраду Дзяржынскага эксперыментальна-механічнага завода Надзеяй КАНАКОВАЙ і высветлілі ўсе нюансы яе працы.**



— Наогул па першай адукацыі я швачка-кравец, але неяк з тым не склалася. А вось працаваць зваршчыцай падабаецца! *(Смяецца.)* Мне часта задаюць пытанне: чаму пайшла менавіта ў гэтую сферу? Я шмат чаго ведала аб прафесіі, бо мой муж працуе зваршчыкам, ён часта расказваў пра свае будні, і мяне яго распаведы прыцягвалі. У нейкі момант проста зразумела, што мне ўсё гэта цікава і што я хачу паспрабаваць сябе ў новай справе. Вядома, блізкія людзі былі здзіўлены маім выбарам, калі шчыра, нават цяпер, праз сем гадоў, многія яго паранейшаму не разумеюць.

Варта нагадаць, што прафесія зваршчыка вельмі складаная, а часам нават небяспечная. Далёка не ва ўсіх атрымліваецца асвоіць яе з першага разу, але гэта дакладна не пра нашу гераіню.

— Лёс мне ўсміхнуўся: я вучылася адразу на заводзе. Прыйшла туды па аб'яве, пачала працаваць, і, на маё здзіўленне, усё атрымлівалася з лёгкасцю. Я думаю, усё выходзіла так проста, таму што ў мяне было жаданне, а таксама разуменне таго, як гэта ўладкавана. Бо калі чалавек мэтанакіраваны, то ў яго ўсё будзе атрымлівацца, — дзеліцца Надзея.

Праз нейкі час пасля навучання дзяўчына атрымала другі разрад, потым трэці, а цяпер ужо чацвёрты з шасці магчымых! Яна даўно паўнавартасны член каманды і выконвае тую ж работу, што і мужчыны. Займаецца металаканструкцыямі, катламі пад ціскам і многім іншым. Працаваць, гэтаксама, як і вучыцца, у суразмоўніцы, паводле яе слоў, атрымліваецца з лёгкасцю, і, што важна, яна кожны дзень ідзе на завод з усмешкай і добрым настроем.

*(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)*

# «РЭЦЭПТ» ШКОЛЬНАГА ШЧАСЦЯ

## КОЖНЫ ТРЭЦІ

У мінулым навучальным годзе профільныя педкласы скончылі 2182 чалавекі. 630 з іх атрымалі рэкамендацыі педсаветаў, якія даюць права паступаць на адпаведныя спецыяльнасці без экзаменаў — толькі па выніках гутаркі. Гэта 30 % ад агульнай колькасці выпускнікоў, хоць па рэгіёнах лічбы істотна адрозніваюцца: так, у Брэсцкай і Гомельскай абласцях рэкамендацыі атрымалі больш за 40 % выпускнікоў педкласаў. У Мінску — 18 %, хоць менавіта ў сталіцы найбольш востра адчуваецца дэфіцыт настаўнікаў пачатковых класаў і педагогаў дашкольнай адукацыі, а ў Віцебскай вобласці яшчэ менш — толькі 16 %. «Мы лічым, што 30 % па краіне — гэта добры паказчык, які сведчыць, што педагагічныя саветы не раздаюць рэкамендацыі ўсім запар, а ацэньваюць прафесійную матывацыю сваіх вучняў», — падкрэслівае Аляксандр Жук.

**Гэта важна!**

**Правы паступаць на педагагічныя спецыяльнасці без экзаменаў ёсць толькі ў тых выпускнікоў педагагічных класаў, хто мае па ўсіх прадметах у атэстаце адзнакі ад 7 да 10 балаў, а па профільных прадметах, якія вывучаюцца на павышаным узроўні, — не менш за 8. Да таго ж вучні павінны атрымаць разгорнутую характарыстыку-рэкамендацыю педагагічнага савета ўстановы адукацыі для паступлення. На сайце «Педагагічныя класы» (https://pedklassy.bspu.by) у раздзеле «Пытанні, што часта задаюць» можна прачытаць пра тое, як праходзіць гутарка і якія дзейнічаюць крытэрыі ацэньвання яе вынікаў.**

Трэба заўважыць, што тры гады таму магчымасць залічэння выпускнікоў педкласаў пры паступленні на педагагічныя спецыяльнасці без здачы ЦТ, толькі па выніках гутаркі, у грамадстве ўспрынялі па-рознаму. У прыватнасці, выказваліся думкі, што ім далі занадта вялікія льготы. Маўляў, у педагагічны ўніверсітэт пойдуць усе без разбору, у тым ліку і тыя, хто не можа добра здаць цэнтралізаванае тэсціраванне.

У Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт па выніках гутаркі, без экзаменаў, былі сёлета залічаны на першы курс 132 выпускнікі педкласаў. Яшчэ 62 чалавекі не скарысталіся льготай і здавалі ЦТ. Такім чынам, студэнтамі сталі калі 200 навучэнцаў профільных класаў, гэта прыблізна чвэрць ад агульнага набору на першы курс.

— Хацелася б падкрэсліць, што ў БДПУ ідуць добра падрыхтаваныя выпускнікі педпрофілю з сярэднім балам школьнага атэстата не менш за 8,5, — кажа Аляксандр Жук. — А ў многіх сярэдні бал перавышае 9. Па выніках апошняй сесіі, што вельмі важна, сярэдні бал у студэнтаў — выпускнікоў педкласаў склаў 8 з 10 балаў. Гэта супастаўляльна з сярэднім балам студэнтаў з кола медалістаў, якія таксама паступаюць у педуніверсітэт без экзаменаў. А ў асноўнай масы студэнтаў сярэдні бал на сесіі быў 6,8, гэта значыць, што ў студэнтаў, якія навучаліся ў педкласах, паспяхоў у ВНУ на адзін бал вышэйшая!

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*



**Міхаіл Кудзейка: «А што вы самі можаце зрабіць як будучыя настаўнікі?»**

## ПЕРШЫ ДОСВЕД

Неабходнасць стварэння партфоліа была калісьці самым складаным момантам падчас навучання ў педкласе. Але ў параўнанні з папярэднімі гадамі ў выпускнікоў 2019 года такія работы вылучаліся сістэмнасцю, вялікім аб'ёмам і наяўнасцю ўсіх рэкамендаваных раздзелаў. Навучэнцы пацвердзілі, што работа над партфоліа дапамагае ім правесці самадыягностыку ўласных педагагічных здольнасцяў, адрэфлексаваць сваю педагагічную дзейнасць, прывучае да пастаяннай фіксацыі дасягненняў і няўдач.

Навучэнцы, якія праходзілі субяседаванне, маюць вопыт узаемадзеяння, вылучаюцца камунікабельнасцю, упэўненасцю ў сабе, у іх больш развітыя аратарскія навыкі, эмацыянальны інтэлект, здольнасць працаваць у камандзе — так званыя soft skills, навыкі XXI стагоддзя, патрэбныя ў штодзённым і прафесійным жыцці.

Абсалютная большасць іх ужо маюць вопыт навукова-даследчай работы, з'яўляюцца ўдзельнікамі адпаведных канферэнцый рознага ўзроўню (ад школьнага да рэспубліканскага), што яны пацвердзілі дыпломамі і пасведчаннямі, якія прыклалі да сваіх партфоліа.

**Будзь у курсе!**

**Усе навучэнцы педагагічных класаў і груп наведваюць факультатыўныя заняткі «Уводзіны ў педагагічную прафесію». Вось што кажуць яны самі. «Дзякуючы ім я стаў больш упэўненым». «Асабліва каштоўныя для мяне былі веды і ўменні ў галіне кіравання канфліктамі і міжасабовага ўзаемадзеяння». «Педагагічныя спробы былі новым і цяжкім для мяне досведам. Не думала, што настаўнік павінен так шмат зрабіць, каб правесці ўрок». «Педагагічны клас — ідэальная знаходка для навучэнцаў, якія мараць пра паступленне ў педагагічны ўніверсітэт».**

— Мы ўважліва сочым за тым, хто да нас прыйшоў, ці не было гэта памылкай. Што вельмі радуе, дык гэта сацыяльная актыўнасць выхаванцаў педкласаў, іх лідарскія якасці, гатоўнасць браць на сябе адказнасць. Сярод іх шмат старастаў вучэбных груп. Дэканаты спецыяльна высвятляюць, хто навучаўся ў педкласе, каб вызначыцца з кандыдатурамі. Яны задзейнічаны ва ўсіх нашых найважнейшых мерапрыемствах, адукацыйных і сацыяльных праектах, далучаюцца да прафсаюзных спраў, валанцёрскага руху, працуюць у студатрадах, удзельнічаюць у «зорных паходах», творчым і спартыўным жыцці ўніверсітэта, — падкрэслівае Аляксандр Жук. — А студэнты Інстытута інклюзіўнай адукацыі стварылі ва ўніверсітэце клуб выпускнікоў педагагічных класаў. У іх ёсць агульная платформа, што аб'ядноўвае, яны пачынаюць групавацца ў своеасаблівае братэрства. Праект «Стаць студэнтам на адзін дзень» — таксама ініцыятыва выпускнікоў педкласаў.

## АСАБЛІВАЯ КАТЭГОРЫЯ

У БДПУ адсочваюць, як адаптуюцца першакурснікі да адукацыйнага працэсу. Штогод у лютым пасля заканчэння зімовай сесіі праводзяць спецыяльнае анкетаванне. «Ці ўпэўнены вы ў гэты момант у правільнасці свайго выбару педагагічнай прафесіі?» — запыталіся ў выпускнікоў педкласаў. Станоўчы адказ далі 68 % апытаных, а 32 % паведамілі, што ў іх было яшчэ недастаткова часу для таго, каб гэта ацаніць. На пытанне «Калі б у вас была магчымасць зноў паступаць ва ўніверсітэт, ці выбралі б вы тую ж спецыяльнасць?», 81 % далі адназначна станоўчы адказ.

Пацікавіліся ў «навабранцаў» і тым, як яны спраўляюцца з вучэбнай нагрузкай. Вынікі апытання сведчаць, што выпускнікі педкласаў пазіцыянуюць сябе як моцныя студэнты. 42 % спраўляюцца без праблем. Яшчэ 34 % таксама спраўляюцца, але прызнаюцца: думалі, што будзе прасцей. 14 % не заўсёды спраўляюцца з-за ўласнай неарганізаванасці, і толькі 10 % апытаных канстатавалі, што вучоба даецца ім з вялікімі цяжкасцямі ў сувязі з вялікім аб'ёмамі падрыхтоўкі да заняткаў.

На пытанне «Ці дапамагло вам навучанне ў педкласе прасцей адаптавацца да вучэбнага працэсу ва ўніверсітэце?» 20 % адказалі, што вельмі дапамагло, 46 % адказалі «так», 24 % — «часткова» і толькі 10 % далі адмоўны адказ.

— Мы ўсведамляем усю ступень адказнасці за стварэнне ў нашым універсітэце адпаведнага адукацыйнага асяроддзя для падрыхтоўкі педагогаў новага пакалення, — запэўнівае Аляксандр Жук. — Выпускнікі педкласаў — асаблівая катэгорыя студэнтаў, з якімі трэба працаваць па-новаму. Яны ўжо маюць першасны вопыт педагагічнай дзейнасці, уяўленне пра спецыфіку педагагічнай прафесіі, веды, навыкі і кампетэнцыі, неабходныя паспяховаму педагогу.



**Таццяна Калодзіч: «Менавіта ў «Крылах» я яшчэ раз пераканалася, што хачу стаць педагогам...»**

## А ХТО ГАЛОЎНЫ?

Цікава было даведацца, а што будучыя педагогі думаюць пра сённяшнюю школу? Якой яны яе бачаць? **Міхаіл КУДЗЕЙКА, кандыдат педагагічных навук, дацэнт кафедры менеджменту і адукацыйных тэхналогій Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі БДПУ,** прапанаваў школьнікам пакласці ў «мех шчасця» ўсё, што можа, на іх погляд, зрабіць школу больш шчаслівай. А дапамагала яму ў гэтым **Таццяна КАЛОДЗІЧ, вучаніца выпускнога класа пінскай сярэдняй школы № 11.** Як прызнаецца дзяўчына, калісьці яна нават не магла сабе ўявіць, што зможа працаваць з дзецьмі, бо звычайны адказ каля дошкі быў для яе магутным стрэсам. А сёння гэта ўпэўненая ў сабе вучаніца педгрупы, у якой за плячыма багаты вопыт валанцёрскай дзейнасці, работа ў гарадскім дзіцячым парламенце.

— Гэтым летам я знаходзілася ў Нацыянальным адукацыйна-аздараўленчым цэнтры «Зубраня» ў ролі члена валанцёрскага атрада «Крылы», — кажа яна. — Маёй задачай была дапамога ў арганізацыі адпачынку дзяцей малодшага ўзросту — ад 6 да 9 гадоў. У атрадзе былі самыя маленькія, і гэта быў для мяне проста неверагодны педагагічны досвед. Яны давяраюць табе цалкам. Асабліва цяжка ім у пачатку змены, калі малыя яшчэ сумуюць па сваіх бацьках, і напрыканцы, калі яны зноў сумуюць. Вось тут і патрэбна дапамога валанцёраў. Менавіта ў «Крылах» я яшчэ раз пераканалася, што хачу стаць педагогам, паступіць у БДПУ, таму што гэта справа мне па душы. Я разумею, што абрала няпросты шлях: для таго каб стаць сапраўдным педагогам, трэба набыць шмат прафесійных навыкаў, але ўсё ў маіх руках.

На думку Таццяны і іншых юнакоў і дзяўчат, што навучаюцца ў педагагічных класах, шчаслівая школа немагчымая без супрацоўніцтва і прафесіяналізму настаўніка. Яны вельмі высока ставяць аб'ектыўнасць у адносінах і прыняцце розных пунктаў погляду, адсутнасць дыскрымінацыі і ціску з боку настаўніка, уменне суперажываць, паважлівае стаўленне да ўсіх вучняў незалежна ад іх здольнасцяў, эмацыянальны і псіхалагічны камфорт, заахвочванне інтарэсаў дзіцяці, свабоду выбару прадметаў, зьмяншэнне вучэбнай нагрузкі. Цікава, што такія моманты, як тэхнічная абсталяванасць школы і адмена школьнай формы, згадваліся далёка не ў першую чаргу. Дзеці адчуваюць, што не яны галоўныя, што школа не для іх, яны толькі сродак. А вучні хочуць, каб з імі размаўлялі, каб дапамаглі рэалізаваць свой патэнцыял, ім нецікава быць толькі сродкам для добрых паказчыкаў школы.

«А што вы самі можаце зрабіць як будучыя настаўнікі?» — запытаўся ў старшакласнікаў Міхаіл Кудзейка. «Мы можам быць аб'ектыўнымі», «Развіваць у сваіх вучнях упэўненасць ва ўласных сілах», «Слухаць і чуць іншага», «Быць талерантнымі», «Быць крэатыўнымі і заахвочваць крэатыў з боку сваіх выхаванцаў», «Паважаць іх і разумець», — пасыпаліся адказы. «Віншую, вы вынайшлі рэцэпт школьнага шчасця — у школе павінен быць найперш пазітыў. Шчасце — гэта калі табе рады, вераць у твае магчымасці і табе давяраюць», — падсумаваў дыскусію выкладчык.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
**Фота аўтара і прэс-службы БДПУ.**

**• Даведка**

**Першыя 102 педагагічныя класы і групы былі адкрыты ва ўсіх рэгіёнах Беларусі ў 2015/2016 навучальным годзе. На наступны год іх колькасць павялічылася ўтрая. Цяпер ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі працуюць ужо 438 педагагічных класаў і груп, у якіх навучаюцца 4036 чалавек. Лідзіруе па гэтым паказчыку Гродзенская вобласць — у рэгіёне дзейнічаюць 93 педагагічныя класы, у якіх навучаюцца 835 чалавек. Далей ідзе Мінская вобласць — 92 класы і 767 навучэнцаў. У іншых рэгіёнах і ў сталіцы колькасць класаў вар'іруецца ад 45 да 59.**



*Камандны дух*

# БРСМ — У ПАРЛАМЕНЦЕ

**Цэнтрвыбаркам апублікаваў прозвішчы кандыдатаў, абраных у склад Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу сёмага склікання. Ёсць сярод іх і прадстаўнікі Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі, якія сталі дэпутатамі парламента і ўтварылі ў ім невялікую каманду. Як ужо паведамлялася раней, па выніках электаральнай кампаніі БРСМ разлічваў на стварэнне ў парламенце маладзёжнай групы. Усяго на дэпутацкія мандаты ў Палаце прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу сёмага склікання прэтэндавала дзесяць членаў Саюза моладзі. Яны былі вылучаны кандыдатамі як шляхам збору подпісаў, так і працоўнымі калектывамі, палітычнымі партыямі.**

У выніку ў каманду Саюза моладзі ў парламенце ўвайшлі Наталля Голуб — першы сакратар Бярозаўскага раённага камітэта БРСМ, Ігар Завалей — першы сакратар Гомельскага абласнога камітэта БРСМ, Павел Міхалюк — першы сакратар Гродзенскага абласнога камітэта БРСМ, Вера Шырокая — дырэктар Бабруйскага дзяржаўнага каледжа імя А. Я. Ларына, Сяргей Клішэвіч — першы сакратар Мінскай гарадской арганізацыі БРСМ, Марыя Васілевіч — рэдактар аддзела рэдактараў галоўнай дырэкцыі падрыхтоўкі тэлепраграм генеральнага прадзюсарскага цэнтра Белтэлерадыёкампаніі.

Нагадаем таксама, што ў першы дзень датэрміновага галасавання на выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі даў старт маладзёжнай эстафеце «#яприду», скіраванай на павышэнне электаральнай актыўнасці маладых выбаршчыкаў, тых, хто галасуе ўпершыню.

Да 17 лістапада па ўсёй краіне пад эгідай БРСМ адбылося больш за 200 мерапрыемстваў маладзёжнай эстафеты: акцыі «Мая Беларусь — мой выбар!», «Моладзь выбірае будучыню!», «Малады выбаршчык», «Моладзь галасуе», палітыка-прававыя гульні «Выбарчы ўчастак», «Я будучы выбаршчык», інтэлектуальныя квэсты «Прававы лабірынт», «Сцежка выбаршчыка», адкрытыя дыялогі «Беларусь і Я».

А ў сацыяльных сетках з'явіліся стыльныя электаральныя плакаты. Такім спосабам каманда БРСМ заклікала маладых людзей прыйсці на выбары і праявіць сваю актыўную грамадзянскую пазіцыю.

— Наша каманда запусціла нязвыклы для мэтавай аўдыторыі кантэнт. Мы выдатна разумеем, што зараз знаходзіцца ў трэндзе SMM і дызайну фатаграфій, і ідзём у нагу з часам. Запуск кампаніі «#яприду» сімвалічны: мы закранулі сацыяльныя і, галоўнае, маладзёжныя пытанні, паказаўшы звычайных беларускіх студэнтаў у іх штодзённай абстаноўцы — у метро, на вуліцы, у гандлёвым цэнтры. Але зрабілі гэта з новага ракурсу. Нам дапамог малады фатограф Максім Кісель. Фармат незвычайны, аднак водгукі падпісчыкаў нашых суполак «УКантакце» і «Інстаграм» прыемна здзіўляюць, — расказала падчас запуску суаўтар маладзёжнага праекта «#яприду» Хрысціна Кечко.

12 лістапада ў сацыяльнай сетцы «УКантакце», а таксама сэрвісе «Інстаграм» стартаваў сэлфі-конкурс БРСМ «#МолодежьГолосует». Мінская гарадская арганізацыя Саюза моладзі прапанавала маладым людзям зрабіць сэлфі на выбарчым участку ў дні датэрміновага галасавання і 17 лістапада, апублікаваць яго на сваёй старонцы «УКантакце» або акаўнце ў «Інстаграме» з хэштэгамі #выборы2019, #молодежьголосует, #яголосую і адзначыць афіцыйны акаўнт БРСМ Мінска @minskbrsm.

Адразу ж пасля публікацыі сэлфі карыстальнік аўтаматычна рабіўся ўдзельнікам конкурсу, які завяршыўся 17 лістапада ў 23:59. Вынікі былі падведзены 19 лістапада і апублікаваны ў сацыяльнай сетцы «УКантакце» ў групе «Мінск — БРСМ | Мінск — сталіца моладзі!»

Аўтараў дзесяці самых крэатыўных сэлфі ўзнагародзілі памятнымі сувенірамі. Абсалютны пераможца конкурсу атрымаў у падарунак фітнес-бранзалет.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

*Ідэі маладых*

# З характарам даследчыка

**Стварыць свой сайт, правесці экскурсію па невядомых месцах, убудаваць у дом ARM-мікракантролер або зрабіць электронную кнігу для невідушчых дзяцей — гэта толькі малая частка таго, што яны могуць. Менавіта з такімі ініцыятыўнымі, амбіцыйнымі і, безумоўна, таленавітымі хлопцамі і дзяўчатамі мы пазнаёміліся на Мінскім абласным этапе конкурсу работ даследчага характару навучэнцаў устаноў агульнай сярэдняй і прафесійнай адукацыі.**



**Пераможцы прадставяць Мінскую вобласць на заключным этапе рэспубліканскага конкурсу ў 2020 годзе.**

У гонар Года малой радзімы многія яго ўдзельнікі заняліся даследаваннем сваёй краіны і развіццём турызму. Так, напрыклад, Уладзіслаў Данілковіч, вучань 11 класа Мінскага дзяржаўнага абласнога ліцэя, стварыў экскурсію па дузе Струвэ.

— Яна была створана каля 150 гадоў таму з мэтай дакладна вымераць форму і памеры Зямлі, уяўляе сабой сетку з геадэзічных пунктаў, якая праходзіць па шэрагу краін. У Беларусі такіх 19, пяць уваходзяць у спадчыну ЮНЕСКА. Менавіта па іх і па славутасцях, што знаходзяцца побач, мы і задумалі пракласці наш турыстычны маршрут. Калі правялі пробную экскурсію, надумалі зрабіць на сайце электронную карту для любога, хто жадае азнаёміцца. Збіраемся працягваць праект, спадзяюся, што пачынанні перарастуць у штосьці маштабнае, — падзяліўся юнак.

Вучаніца 10 класа Турэц-Баярскай сярэдняй школы Маладзечанскага раёна Вікторыя Паўлоўская вырашыла ўдасканаліць звыклую ўсім форму экскурсіі і стварыла мабільную праграму, якая дазваляе праходзіць адмысловы квэст на аснове тапанімічнага матэрыялу.

— Па тых, хто побач, — сябрах, аднакласніках — я зразумела, што вельмі мала хто з нас сам праяўляе жаданне з'ездзіць на якую-небудзь экскурсію. У асноўным, усе цяпер проста «заліпаюць» у тэлефонах. Таму і вырашыла аб'яднаць мабільныя гаджэты і магчымасць пазнаць нашу краіну. З дапамогай навуковага кіраўніка зрабіла праграму, праз якую кожны можа не толькі пазнаёміцца з прыродай і славутасцямі таго ці іншага раёна, але і прайсці розныя тэматычныя заданні.

Падобная ідэя ўзнікла і ў Ягора Шыкаўца, вучня 10 класа нарачанскай сярэдняй школы № 2 Мядзельскага раёна. Яго праект — вэб-сайт «Мая Нарач» — для прыцягнення турыстаў на сваю малую радзіму.

— Адкрыўшы яго, можна адразу ўбачыць інфармацыю аб возеры і нашым курортным пасёлку, розныя навіны, фотагалерэю. А яшчэ ёсць віртуальная карта, дзе госці Нарачы могуць паглядзець усе славутасці і адразу выбраць сабе жаданы маршрут. Цяпер мы працягваем удасканальваць сайт: распрацоўваем рэкламу, паляпшаем афармленне і тэхнічныя магчымасці, у прыватнасці, плануем увесці розныя мовы для наведвальнікаў. Я лічу, што пра Нарач павінны даведацца як мага больш людзей, бо гэта не проста возера, а самы прыгожы і вялікі курорт Беларусі, — расказаў Ягор.

У час інфармацыйных тэхналогій цяжка адкрыць нешта новае ў гэтай сферы, але ўдзельнікі конкурсу здолелі здзівіць журы. Іх вынаходкі аказаліся не толькі цікавымі, але і карыснымі.

Максім Жыдовіч, вучань 11 класа дзяржынскай гімназіі № 1, прадставіў праграму кросплатформеннага «разумнага дома» на ARM-мікракантролеры. Яна дазваляе кантраляваць усе электрычныя прыборы і святло ў жыллі і кіраваць імі.

— Гэтая праграма не з'яўляецца навінкай у свеце, проста ў Беларусі яна чамусьці не так папулярная, як за мяжой. Аднак у майго праекта ёсць некалькі адметнасцяў, якія робяць яго лепшым за замежныя аналагі. Калі выводзіць яе на рынак, яна будзе ў некалькі разоў таннейшай, дзякуючы выкарыстаным матэрыялам. Не трэба купляць ніякага габарытнага абсталявання, рэгістравацца, нават інтэрнэт не патрэбны, трэба проста падключыцца да сістэмы і ўвесці ў пошукавы радок патрэбны IP-адрас. І вы зможаце кантраляваць свой дом з любой часткі свету, — расказаў аўтар распрацоўкі.

Вучань 9 класа бярэзінскай гімназіі Кірыл Цітоў узняў важную сацыяльную праблему і змог знайсці яе рашэнне. Ён стварыў электронную кнігу для невідушчых.

— Гэта, хутчэй, буквар для дзяцей, — патлумачыў хлопец. — Для яго мы абралі найбольш распаўсюджаны шрыфт Брайля. Наш праект яшчэ не завершаны, мы будзем развіваць яго. Хочацца, каб у будучыні такія электронныя кнігі палегчылі жыццё людзям без зроку.

**Ангеліна НОВІКАВА, студэнтка III курса Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.**

*У актыўным рытме*

# ЗДОЛЬНАЯ ЗАПАЛІЦЬ ІДЭЯЙ

**Восенню мінулага года Анастасія ТАБОЛІЧ пазнаёмілася з першым сакратаром Смалявіцкага раённага камітэта БРСМ Каралінай Гарошчык. Тая адразу заўважыла камунікабельнасць і харызматычнасць дзяўчыны, ацаніла яе патэнцыял да работы з людзьмі і прапанавала паўдзельнічаць у адной са штогадовых акцый. Дзяўчына пагадзілася. І ёй так спадабалася, што з тых часоў Насця — пастаянны ўдзельнік усіх мерапрыемстваў, што ладзіць Саюз моладзі. У сваёй сярэдняй школе № 3 яна — сапраўдны завадатар. Трэба дапамагчы арганізаваць нешта? Дзяўчына падрабязна і эмацыянальна раскажа пра ідэю аднакласнікам, і ахвотных далучыцца адразу ж з'явіцца.**

За год актыўнасці школьніца паўдзельнічала больш чым у дваццаці мерапрыемствах і акцыях БРСМ. Яна наведвала маланаселеныя пункты раёна, дзе разам з іншымі юнакамі і дзяўчатамі расказвала мясцовым жыхарам аб правілах пажарнай бяспекі. Падтрымлівала акцыю «Дзень бяспекі. Увага ўсім!» у Смалявічах. Была камісарам экалагічнага атрада, які дзейнічаў на базе мясцовага лягасаа. Брала ўдзел у абласным адкрыцці трэцяга працоўнага семестра ў Маладзечне, куды былі запрошаны найбольш актыўныя члены БРСМ з усіх раёнаў Мінскай вобласці, у маладзёжным марафоне «75», прысвечаным гадавіне вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Была валанцёрам руху «Добрае Сэрца», калі арганізоўваўся збор школьнага адзення і абутку, канцылярскіх прылад, навучальных дапаможнікаў, спартыўных тавараў і іншых рэчаў, неабходных дзецям з маламаёмасных сем'яў для падрыхтоўкі да навучальнага года.

Караліна Гарошчык з гонарам і ўдзячнасцю кажа пра самага актыўнага члена БРСМ сярод школьнікаў раёна:

— Насця — яркі прадстаўнік Саюза моладзі! Яна спагадлівая і добрая, заўсёды гатовая прыйсці на дапамогу. Справядлівая, сумленная і разважлівая, як сапраўдны баец маладзёжнага атрада аховы правапарадку. Працавітая, уседлівая і адказная, словам, камісар атрада! Дзякуй ёй за шчырую работу і намаганні.



Анастасія Таболіч *(другая злева).*

Сама дзяўчына адзначае, што з пачаткам яе актыўнасці ў БРСМ яна стала больш упэўненая ў сабе, пачала лепш разбірацца ў людзях, атрымала шмат навыкаў па арганізацыі мерапрыемстваў і ў стасунках з людзьмі. Усё гэта абавязкова спатрэбіцца ў жыцці, бо дзяўчына вучыцца ў 11 класе і рыхтуецца да паступлення ў БДПУ імя М. Танка. Марыць стаць педагогам.

Як захопленая энтузіястка, Анастасія жадае кожнаму чалавеку знайсці справу па душы, дзе спатрэбіцца менавіта яго энергія і здольнасці!

**Паліна ПРАКАПЕНЯ, студэнтка II курса факультэта журналістыкі БДУ.**

**Фота дадзена Смалявіцкім РК БРСМ.**

ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА
21 11 2019 г.

*Свой выбар*

# УНУТРАНАЕ ПРАДЧУВАННЕ

## Гэта яно прывяло ў міліцыю Карыну і Караліну

**Дваццацідвухгадовая Карына ЯРАШЭВІЧ і дзевятнаццацігадовая Караліна ЮХНІК са школьных гадоў ведалі, з чым хочуць звязаць сваю будучыню. Цяпер яны — маладыя спецыялісты ў раённым аддзеле ўнутраных спраў гарадскога пасёлка Акцябрскі Гомельскай вобласці. Як ім на першым рабочым месцы?**



Выпускны лейтэнанта Карыны Ярашэвіч.

Карына родам з Рагачова. Скончыла Акадэмію МУС па спецыяльнасці «Правазнаўства», з лета гэтага года працуе па размеркаванні ў РАУС на пасадзе інспектара крымінальна-выканаўчай інспекцыі.

— З чацвёртага класа вызначылася, што хачу насіць пагоны на плячах. Пры выбары прафесіі не абапіралася ні на заробак, ні на прэстыжнасць, арыентавалася толькі на ўнутранае прадчуванне. Пасля восьмага класа паступіла ў Мінскае абласное кадэцкае вучылішча ў Слуцку на факультэт міліцыі. Лічу, што атрымала там добры вопыт для далейшай кар'еры. Да таго ж там сустрэла свайго будучага мужа Антона. Цяпер у мае абавязкі ўваходзіць прафілактычнае назіранне і кантроль за асуджанымі: пошук тых, хто мае судзімасць, праверка іх па месцы жыхарства, вынясенне пакарання ў выглядзе грамадскіх работ і іншае. Акрамя таго, нямала часу займае афармленне дакументаў, — дзеліцца дзяўчына.

Наваспечаны спецыяліст кажа, што спачатку ўключыцца ў працэс было нялёгка, але дапамагла падтрымка родных і сяброў. Карына прызнаецца, што цяпер нават на выхадных цяжка пазбавіцца ад думак пра работу, бо прафесія вымушае быць заўсёды на сувязі.

— Перажывала, што да мяне будуць ставіцца несур'ёзна з-за ўзросту. Але ў большасці выпадкаў тыя, хто стаіць на ўліку ў РАУС, не ігнаруюць мае патрабаванні. У залежнасці ад планаў на дзень мне трэба або знаходзіцца на сваім месцы ў аддзеле, або выязджаць у вёскі на праверку асуджаных. Мяне такія абавязкі не палохаюць. Канешне, бывае, што сутыкаюся з хамаватымі людзьмі, якія даюць волю эмоцыям, не кантралюючы сябе. Таму важна быць псіхалагічна падрыхтаваным, дзесьці прамаўчаць, а дзесьці павысіць голас, — працягвае Карына. — Фізічная падрыхтоўка таксама павінна быць добрай. У вольны час імкнуся ёй займацца. Удзяляць увагу хочацца і ўнутранаму свету, самаразвіццю. Таму ў планах — атрымаць дадатковую адукацыю псіхолага. Гэта дапаможа як у службовай дзейнасці падчас работы з людзьмі, так і ў побыце.

Карына ўспамінае: да размеркавання знаёмыя жартавалі, што яна не вытрымае на новым месцы і некалькіх тыдняў, маўляў, стане вельмі сумна.

— Але я знайшла сабе заняткі па душы: спорт на свежым паветры, прыгатаванне дамашніх страў для знаёмых. Шчыра кажучы, для мяне не так важна, дзе я жыву. Галоўнае — каб побач былі добрыя людзі, — упэўнена суразмоўніца.

А для Караліны размеркаванне ў Акцябрскі не было сюрпрызам, бо дзяўчына сама адсюль родам. Пасля дзявятага класа паступіла ў Мінск у каледж бізнесу і права, адвучылася па спецыяльнасці «Правазнаўства», атрымала дыплом юрыста. З ліпеня гэтага года — на пасадзе інспектара групы кадраў у РАУС.

— Больш працую з дакументамі, чым з людзьмі, але мне гэта вельмі падабаецца! Кожны новы рабочы дзень для мяне праходзіць насычана. Бываюць цяжкасці, але без іх ніяк, гэта карысны вопыт. Старэйшыя калегі заўсёды дапамагаюць і словам, і справай, а я імкнуся зрабіць усё правільна, — расказвае Караліна.

— Што было вырашальным падчас вызначэння з прафесіяй? — пытаюся ў гераіні.

— З малодшых класаў была ўпэўнена, што стану міліцыянерам. Глядзела серыял «Вяртанне Мухтара» і ўяўляла сябе на месцы галоўных герояў. Пазней мэтанакіравана рыхтавалася да паступлення ў каледж. Дарэчы, мне заўсёды хацелася быць падобнай да старэйшай сястры, якая цяпер служыць у сталіцы ў адным з падраздзяленняў органаў унутраных спраў, — адказвае дзяўчына. — У міліцыі працаваць змогуць, напэўна, не ўсе. Тут патрэбны цвёрды, стрыманы характар, упартасць і працавітасць. У мяне гэта ёсць, што дапамагае ў многіх сітуацыях. Зразумела, што, калі прыходзіш на першае рабочае месца, прысутнічаюць страх і перажыванні. Але я паставіла сабе мэту і рушу да яе.

Да размеркавання дзяўчына тры гады пражыла ў Мінску.

— Пасля навучання ў каледжы зразумела, што мне не хапала той цішыні, якая ёсць на малой радзіме. А цяпер яна са мною, як і мае сваякі, сябры, — кажа суразмоўніца.

Караліна прызнаецца, што быць прыкладам для іншых — гэта тое, да чаго яна імкнецца ў прафесіі: «Спадзяюся, што буду выдатным супрацоўнікам».

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**

*Бачыць мэту*

# ПРАЗ ЦЕРНІ — ДА «КАСМІЧНАЙ» КАВЯРНІ,

## або На што здольныя настойлівасць і падтрымка блізкіх

**Бывае, што брат з сястрой цяжка сыходзяцца характарамі, у іх часта розныя захапленні, але гэта дакладна не той выпадак. Уладзіслаў і Аляксандра САНЬКО з Мазыра заўсёды хацелі мець уласны бізнес. Кожны спрабаваў сябе ў розных сферах, але ажыццявіць мару атрымалася толькі сумесна.**

**Уладзіслаў:** — Усё пачалося з не самай добрай гісторыі... Аляксандра нечакана моцна захварэла і амаль жыла ў бальніцах. Каб яна не думала пра дрэннае і не сумавала, я стараўся адцягваць яе размовамі пра стварэнне бізнесу, літаральна кожны дзень мы абменьваліся рознымі планамі. На шчасце, сястра хутка пайшла на папраўку, а ўсе нашы ідэі пачалі развівацца. Аднойчы прачыталі, што спажыванне кавы расце штогод. І зразумелі: адкрыццё кавярні — наш шанц! Бо гэта той прадукт, які заўсёды будзе запатрабаваны. Да таго ж падчас вучобы я падпрацоўваў у сферы грамадскага харчавання, таму нейкі досвед у мяне ўжо быў. Акрамя таго, для адкрыцця кавярні патрэбны адносна невялікі бюджэт. Супаставіўшы ўсе факты, мы вырашылі, што знайшлі свой ідэальны варыянт. Вялікім плюсам у нашых пачынаннях была наяўнасць адпаведнай адукацыі. Я скончыў Беларускі гандлёва-эканамічны ўніверсітэт спажывецкай кааперацыі ў Гомелі па спецыяльнасці «эканаміст-менеджар».





**Аляксандра:** — Я, наадварот, больш творчы чалавек. Пасля школы пайшла ў архітэктурны каледж, таму што «ўмею, магу і хачу». Спраўлялася з вучобай добра, пасля паступіла ў Мазырскі педагагічны ўніверсітэт імя І. П. Шамякіна на фізіка-інжынерны факультэт. Веды ў галіне архітэктуры спатрэбіліся пры выбары месца і будаўніцтве самой установы.

Праўда, у нашым горадзе цягам паўгода месца мы так і не знайшлі, а выкупляць дзяржаўную зямлю на аўкцыёне (як нам прапаноўвалі) было занадта маштабна, таму вырашылі паспрабаваць у Калінкавічах, гэта зусім недалёка ад Мазыра. І вось тут знайшлі тое, што шукалі. Нарэшце пачаўся этап будоўлі, але цяжкасці не скончыліся. Вядома, што пры стварэнні свайго бізнесу, як ты ні разлічвай, не пазбегнуць фінансавых цяжкасцяў. Таму давялося прадаць аўтамабілі, пазычаць грошы ў сваякоў, знаёмых і сяброў.

Наступным этапам было стварэнне дызайну. Яго замаўлялі ў кампаніі, нам распрацоўвалі брэндбук і лагатып, знешні выгляд першага гандлёвага модуля. Я вельмі хацела стварыць нешта ў тэме бясконцасці. Мы выбралі тэматыку космасу. На рынку яшчэ не было «касмічных» кавярняў, і гэта тое, што нас вылучае сярод канкурэнтаў.

**Уладзіслаў:** — Што да назвы, то тут быў сапраўдны мазгавы штурм! Мы разглядалі розныя варыянты, якія былі б віруснымі, лёгка чыталіся і даносілі сутнасць адразу. У выніку спыніліся на CoffeeCos.

**Аляксандра:** — Мы каля васьмі месяцаў працавалі самі, гэта зніжала нашы пастаянныя выдаткі і дазваляла зразумець і адчуць бізнес знутры. Цяпер з'яўляемся ў кавярні дзесьці раз на месяц, каб пачуць ад гасцей, што ім не падабаецца і дзе трэба нешта выправіць. Гэта насамрэч прымушае працаваць больш і дапамагае імкнуцца да лепшага.

**Уладзіслаў:** — Нядаўна наведалі маштабны бізнес-форум. Пасля яго нашы патрабаванні пры выбары персаналу крыху змяніліся. У першую чаргу важна, каб чалавек мог прыцягнуць увагу госця. Набіраем работнікаў самі з дапамогай платформаў па пошуку работы. Што датычыцца сяброў, то мы атрымалі шмат урокаў і цяпер бяром толькі незнаёмых людзей.

**Аляксандра:** — Нам вельмі хочацца сказаць дзякуй бацькам, якія верылі ў нас. Яны заўсёды казалі: «Спрабуйце!» Вельмі шмат дапамагалі з рамонтам кавярні: Улад з бацькам фарбавалі сцены, клалі плітку, рабілі многае іншае, мама займалася дэкорам і дызайнам. Бацькі ніколі не адмаўлялі, а шчыра ганарыліся намі.

Цяпер, калі мы дасягнулі таго, да чаго так імкнуліся, хочацца падбадзёрыць іншых. Бізнесменам ты не можаш нарадзіцца, але можаш ім стаць. Самае галоўнае — калі ты сапраўды нечага хочаш, то павінен ісці да апошняга. У нас усё атрымалася таму, што мы не здаліся!

**Ангеліна НОВІКАВА, студэнтка III курса Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.**

# ЗВАРШЧЫЦЫ БРУДУ НЕ БАЯЦЦА!

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*



Надзея — не адзіная жанчына-зваршчык на прадпрыемстве, ёсць яшчэ каляжанка. Аднак нейкага асаблівага стаўлення да сябе яны не адчуваюць: патрабаванні да іх такія ж, як і да ўсіх астатніх работнікаў, ніхто не робіць паслабленняў, як той казаў, за прыгожыя вочы...

— У калектыве мы ўсе адно аднаму дапамагаем. Але ў нас здзельная заработная плата, і калі я не буду працаваць як усе, то, натуральна, грошай атрымаю менш, чым астатнія. Адчуваю ад калег не спачуванне, а павагу за тое, што якасна выконваю свае абавязкі нароўні з імі, — тлумачыць суразмоўніца.

Нягледзячы на цяжкую працу, маладая зваршчыца заўсёды знаходзіць магчымасці заставацца жаноцкай.

— У маёй рабоце трэба быць засяроджанай, сур'ёзнай, спраўляцца з фізічнымі нагрузкамі, а вось дома я заўсёды добрая мама і каханая жонка. Хоць і не фарбуюся на вытворчасці, усё роўна адчуваю сябе заўсёды прыгожай. *(Смяецца.)* Наогул, я не лічу, што мая работа «не жаночая». Проста не кожная дзяўчына не «пацягне», ды і шмат хто проста не захоча. Каб працаваць зваршчыкам, трэба быць мэтанакіраванай, моцнай, да таго ж не баяцца бруду.

Мала хто ведае, што ёсць адмысловы міжнародны конкурс для зваршчыкаў. Ён штогод праходзіць у Мінску і ўключае ў сябе некалькі намінацый. Надзея ўжо другі год удзельнічае ў гэтым прафесійным спаборніцтве ў намінацыі «Механізаваная зварка ў сумесях актыўных газаў MIG/MAG». Летась яна заняла 20-е месца сярод 140 удзельнікаў, сёлета — 21-е. Аднак не збіраецца спыняцца і налета хоча ўзяць удзел у конкурсе зноў — з надзеяй на вышэйшае месца.

**Ангеліна НОВІКАВА, студэнтка III курса Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.**

*Нябачныя масты*

# ПА ВЕДЫ — У КІТАЙ


На Вялікай Кітайскай сцяне.

**Псіхолагі сцвярджаюць, што, каб зразумець сябе, няма спосабу, лепшага за выхад з зоны камфорту і за паездку на працяглы час у іншую краіну. Вы можаце адчуваць страх перад невядомасцю і непрадказальнасцю ці прыемнае хваляванне і расслабленне... Усе гэтыя эмоцыі зведала студэнтка чацвёртага курса факультэта гісторыі, камунікацыі і турызму Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Я. Купалы Паліна АЛЬШЭЎСКАЯ, якой пашчасціла адправіцца на цэлы год на вучобу ў Кітай.**

Пра тое, што ўніверсітэт дае магчымасць вывучэння моў па праграме абмену студэнтамі з замежнымі ВНУ, дзяўчына даведалася задоўга да таго, як паступіла туды. Зыходзячы з гэтага, выбар навучальнай установы, як і другой замежнай мовы, не быў выпадковы. Паліна заўсёды захаплялася кітайскай — цікавай, унікальнай і перспектыўнай. Ідэя яе асваення непасрэдна ў асяроддзі носьбітаў заўсёды здавалася дзяўчыне асабліва прывабнай і прыцягальнай. Абмеркаваўшы з роднымі ўсе нюансы і перавагі навучання ў Кітаі, атрымаўшы ад іх падтрымку і адабрэнне, студэнтка вырашыла сур'ёзна падысці да ўвасаблення сваёй задумкі ў жыццё...

Няхай дзяўчына і раней жыла на адлегласці ад бацькоў і сяброў — яны ў Маладзечне, а яна ў Гродне, — Паліна бачылася з імі як мінімум раз ці два на месяц і ведала, што ў любы момант можа прыехаць дадому. А калі ва ўсёй краіне нікога знаёмага? Калі няма ўсіх тых «падпорак», якія падтрымліваюць нас у жыцці? Але маёй суразмоўніцы пашанцавала: у кітайскую ВНУ разам з ёй па навучальнай праграме адправілася некалькі студэнтаў з гродзенскага ўніверсітэта, у тым ліку яе аднагрупніца. Гэты факт моцна палегчыў адаптацыю на новым месцы.

Каб прыступіць да вучобы, Паліна найперш прайшла тэст на веданне мовы, па выніках якога была размеркавана ў самую вялікую групу студэнтаў — з пачатковым узроўнем валодання. У першым семестры праграма ўключала ў сябе тры прадметы: базавую кітайскую мову, работу з аўдзіраваннем і гутарковую практыку. Навучальны працэс штодня доўжыўся да 12 гадзін дня, акрамя суботы і нядзелі — гэта былі выхадныя дні. У другім семестры асноўную ўвагу пачалі ўдзяляць граматыцы. Дзяўчына перайшла ўжо ў іншую групу з вышэйшым узроўнем валодання мовай: магла размаўляць, падтрымліваць агульныя тэмы.

Як кажуць студэнты: «Пары — гэта святое, але і адпачынак ніхто не адмяняў». Вольнага часу Паліне хапала спаўна: падчас сваіх двух законных выхадных яна паспявала не толькі знаёміцца са славутасцямі Пекіна, але і падарожнічаць за яго межамі. Але, як руплівая студэнтка, да панядзелка вярталася ў інтэрнат, выконвала дамашняе заданне і, напоўненая сіламі і энтузіязмам, ішла на вучобу. У Кітаі студэнты жывуць у кампусах, на тэрыторыі якіх размяшчаецца ўсё неабходнае: сталоўка, бібліятэка, спартыўны комплекс. І правілы падобныя на нашы: трэба вярнуцца ў інтэрнат строга да 12 гадзін ночы. Паліна жыла ў інтэрнаце з хлопцамі і дзяўчатамі, якія, як і яна, прыехалі ў ВНУ па праграмах абмену. Чалавек таварыскі і адкрыты, дзяўчына адразу ж пазнаёмілася і пасябравала з многімі з іх. Знаходзячыся ў міжкультурным асяроддзі, па суседстве са студэнтамі з розных куткоў свету, наша гераіня даведвалася шмат новага пра культуры далёкіх краін і пашырала свой кругагляд. Дзяўчына прызнаецца, што дзякуючы такой магчымасці яна развеяла для сябе шмат міфаў пра рэлігіі і звычаі розных народаў.

— У інтэрнаце ў нас была агульная гасцёўня, дзе мы досыць часта збіраліся вялікай кампаніяй, гаварылі на розныя тэмы і частавалі адно аднаго сваімі нацыянальнымі стравамі, — з цеплынёй прыгадвае наша гераіня. — Чым я толькі не ласавалася, пачынаючы ад пякучай ежы лаосцаў і заканчваючы прысмакамі афрыканцаў, якія раставалі ў роце. Да чаго так і не змагла прызвычаіцца — дык гэта да кітайскай ежы. У большасці выпадкаў яна была тлустая і вострая. Хоць многія за год вучобы прывыклі да такой кухні і, нават прыехаўшы дадому, ужо не маглі ад яе адмовіцца. Асабіста ж у мяне ад страў сыпаліся іскры з вачэй. У Кітаі зусім не такая малочная прадукцыя, як у нас, яна адрозніваецца смакам. Тварог, сыр, пудынгі — рэдкасць. А мне іх так не хапала! У асноўным я гатавала для сябе сама, але часам сілкавалася ў сталоўцы кампуса.

Да чаго было прызвычаіцца не лягчэй, чым да кітайскай ежы, — дык гэта да экалогіі. У Пекіне вельмі забруджанае паветра, часта ўзнікаў смог, асабліва ўзімку. Без маскі знаходзіцца на вуліцы было проста немагчыма.

Але, нягледзячы на такія нюансы, Паліна засталася ў захапленні ад часу, праведзенага ў Кітаі, і ад атрыманых ведаў па мове. Быць часткай новай культуры — даволі дзіўнае адчуванне. Падобны вопыт змяняе жыццё і дорыць незабыўныя ўспаміны.

**Надзея БОБРЫК,**
**студэнтка II курса**
**факультэта міжкультурных**
**камунікацый МДЛУ.**

*Усё — у тваіх руках!*

# ЖЫЦЦЁ, САТКАНАЕ З КРАІН

**Як наведаць Ісландыю за 200 еўра? А праехаць 6000 кіламетраў па ЗША? Гэта і многае іншае ведае вандроўніца Кацярына ВАЛАДЫГІНА. Яна не проста атрымлівае ўражанні ад краін, але і стараецца падзяліцца сваім досведам з цікаўнымі.**


Кацярына ў Ісландыі.

Да 22 гадоў дзяўчына нідзе не была, акрамя некалькіх гарадоў Украіны і Расіі. А потым у яе жыцці з'явіўся чалавек, які ўспрымаў вандроўкі як штосьці абсалютна шараговае. Першай краінай, куды яны запланавалі паехаць, стала Шатландыя. Віза каштавала 120 еўра, плюс патрабаваліся білеты. Агульны кошт пытання склаў 300 долараў. Для маладой спецыялісткі гэта былі касмічныя грошы, а візу ж маглі і не адкрыць.

— Добра памятаю, як усё ж такі рашылася, — кажа Кацярына. — А потым сядзела ў Шатландыі: перада мной быў акіян, за спінай — горы... Думала: хіба можна было не рызыкнуць? Тады я паабяцала сабе, што заўсёды, калі паўстане выбар, буду рабіць яго на карысць вандровак.

А потым была Амерыка. З маршрутам дапамагалі сябры, якія жывуць там некалькі гадоў і шмат падарожнічаюць. Самым яркім успамінам стала паездка да Вялікага каньёна. Было тры варыянты, адкуль ім любавацца: заходні, паўднёвы ці паўночны пункты.

— Мы з маладым чалавекам вырашылі спыніцца на першым, найбліжэйшым для нас. Аднак месца аказалася не самым лепшым для наведвання: для турыстаў дарагавата (60—80 долараў з чалавека), на сваёй машыне заехаць нельга, фатаграфаваць самастойна — таксама. Нам усё гэта не спадабалася. «Колькі да наступнага (паўднёвага) пункта? — падумалі мы. — 300 кіламетраў? Наперад!» Калі дабраліся, ішоў дождж і пачынала змяркацца. Прачнуліся ў пяць гадзін раніцы і паехалі сустракаць світанак на Вялікім каньёне. «Ніхто ж так зрабіць не дадумаецца, толькі мы...» І — убачылі натоўп людзей. Не самы рамантычны момант у жыцці. Потым так атрымалася, што мы блізка апынуліся і да паўночнага пункта. Да заходу сонца 45 хвілін, а ехаць — гадзіну. Нам трэба было паспець! І гэта быў самы атмасферны, нялюдны пункт, з неверагодным рэстаранам на абрыве. Уляцелі як віхор. Быў самы запамінальны дзень вандроўкі, — прыгадвае суразмоўніца.

Маштабная паездка ў ЗША стала канчатковым пераломным момантам у жыцці. За тры тыдні на машыне з сябрам яны праехалі 6000 кіламетраў, паглядзелі ўсе самыя папулярныя штаты і мясціны. Тады дзяўчына канчаткова ўмацавалася ў думцы, што хоча жыць паіншаму. Не сядзець у офісе, дзе яна ўжо не магла працаваць, а займацца тым, чым сапраўды жадае.

А хацелася Кацярыне арганізоўваць мерапрыемствы, дзе будзе панаваць абстаноўка для знаёмстваў і стасункаў. Там можна падзяліцца любым досведам (з вандровак ці з асабістага жыцця), не баяцца расказаць пра праблемы і страхі, знайсці адказы на хвалюючыя пытанні.


Там жа. Уявіце, гарачая крыніца, чэрвень, дзве гадзіны ночы...

Адзін з такіх івэнтаў, пра вандроўкі ў Ісландыю, дзяўчына арганізавала разам з іншым вандроўнікам Арнольдам Гаральскім. З гэтай краіны Каця прывезла адны з самых яркіх успамінаў. Дарэчы, пабывала яна там двойчы, у розныя поры года.

— Узімку больш за ўсё ўразіла гісторыя з паўночным ззяннем. Не столькі яно само, таму што мы бачылі не самае яркае, колькі тое, як мы яго пільнавалі, вырашалі, каму ў які час дзяжурыць. У выніку адзін чалавек з групы прыродную з'яву зaўважыў выпадкова. Відовішча было цудоўнае. А пошук гарачых крыніц у Блакітнай лагуне! Як гэта можа спалучацца: кіпень, лёд і снег? Мы бачылі, як адкалоўся вялізны кавалак лёду і перавярнуўся на другі бок! Зверху ён белы, а знізу блакітны. Такі грукат стаяў! Дарэчы, гэта рэдкая з'ява, — расказвае Кацярына.

Падобнымі гісторыямі вандроўнікі і дзеляцца на арганізаваных сустрэчах. Там цікаўныя могуць даведацца, што білет можна набыць усяго за 50 еўра, калі ўхапіць яго ў правільны час, шмат рэчаў увогуле браць неабавязкова. А калі ехаць вялікай кампаніяй, то і жыллё, і арэнда аўтамабіляў будуць недарагія.

Напрыканцы аповеду прысутныя звычайна настолькі хочуць паехаць у падарожжа, што некаторыя застаюцца і адразу ж купляюць білеты на самалёт разам з Арнольдам. А вяртаюцца з паездкі ўжо сябрамі, пачынаюць бачыцца на радзіме.

...У 29 гадоў у суразмоўніцы за плячыма ўжо каля 30 краін. Што для яе азначаюць вандроўкі?

— Гэта маленькае жыццё. Са сваімі праблемамі, якія трэба хутка вырашаць. Я заўважыла, што ў людзей, якія шмат падарожнічаюць, нібыта іншае адчуванне часу. Тыя моманты, якія ў іншых былі нядаўна (напрыклад, студэнцтва), у мяне адбываліся быццам дзесяць жыццяў таму. Мінулае стагоддзе! Вяртаешся з трохдзённай вандроўкі, а такое адчуванне, што цябе тры месяцы не было. Прынята лічыць, што, калі ты прыязджаеш на месца прызначэння, толькі тады і пачынаецца прыгоды. Але гэта не так! Вось, напрыклад, гульня: бачыш самалёт — і спрабуеш здагадацца, куды ён ляціць. Ёсць праграма, якая дазваляе потым даведацца пра яго сапраўдны маршрут, — кажа Кацярына.

І дадае, што пачынаць вандраваць не абавязкова за межамі Беларусі. У нас таксама ёсць цудоўныя месцы, дзе можна выдатна адпачыць на прыродзе пасля будзённага тлуму: Браслаўскія азёры, возера Свіцязь і нават балоты...

**Юлія АДАМОВІЧ.**

# Извещение о проводимых торгах в форме конкурса на передачу в аренду охотничьих угодий фонда запаса

Березовский районный исполнительный комитет на основании решения Брестского областного исполнительного комитета от 9 января 2019 г. № 7 «О делегировании полномочий» 24 декабря 2019 г. в 10.00 в здании райисполкома, расположенного по адресу: Брестская обл., г. Береза, ул. Красноармейская, 27 (зал заседаний, каб. **19**), проводит торги в форме конкурса по предоставлению в аренду охотничьих угодий фонда запаса со сроком аренды **не менее 20 лет**.

На торги выставляются охотничьи угодья общей площадью 12,9 тыс. га, в том числе: лесных – 9,1 тыс. га, полевых – 1,7 тыс. га, водно-болотных – 2,1 тыс. га в следующих границах:

***северная:*** – от северо-западного угла квартала № 1 Кабаковского лесничества ГЛХУ «Ивацевичский лесхоз» в восточном направлении по административной границе между Пружанским и Березовским районами до места пересечения административных границ Березовского, Пружанского и Ивацевичского районов, далее в восточном направлении по административной границе между Березовским и Ивацевичским районами до северо-восточного угла квартала № 13 Бронногорского лесничества ГЛХУ «Ивацевичский лесхоз»;

***восточная:*** от северо-восточного угла квартала № 13 Бронногорского лесничества ГЛХУ «Ивацевичский лесхоз» в юго-восточном направлении по административной границе между Березовским и Ивацевичским районами до места ее пересечения с автомобильной дорогой Кобрин – Столбцы (Р-2);

***южная:*** от места пересечения административной границы между Березовским и Ивацевичским районами районов с автомобильной дорогой Кобрин-Столбцы (Р-2) в юго-западном направлении по указанной автомобильной дороге до места ее пересечения с железной дорогой Белоозерск – Бронная Гора, далее в северо-западном направлении по указанной железной дороге до места ее пересечения с железной дорогой Минск – Брест, далее в юго-западном направлении по указанной железной дороге до места ее пересечения с железнодорожным переездом возле деревни Круглое, далее в северо-западном направлении по дороге общего пользования до деревни Морможево, далее в северо-восточном направлении по дороге общего пользования до обводного канала ОАО «Опытный рыбхоз «Селец» в квартале № 143 Бронно-Горского лесничества ГЛХУ «Ивацевичский лесхоз», далее в северо-западном направлении по обводному каналу до дамбы водохранилища Селец, далее в южном направлении по дамбе водохранилища Селец до середины дамбы, далее в западном направлении (разделяя водохранилище пополам) до реки Ясельда, далее в западном направлении по реке Ясельда до места ее пересечения с административной границей между Пружанским и Березовским районами;

***западная:*** от места пересечения реки Ясельда с административной границей между Пружанским и Березовским районами в северном направлении по указанной административной границе до места ее пересечения с северо-западным углом квартала № 1 Кабаковского лесничества ГЛХУ «Ивацевичский лесхоз».

Границы участка, не включенного в охотничьи угодья устраиваемого объекта, расположенного в пределах вышеописанных границ, приведены ниже:

***северная:*** от юго-западного угла квартала № 45 Бронно-Горского лесничества ГЛХУ «Ивацевичский лесхоз» в восточном направлении по южным границам кварталов № 45, 46, 65 Бронно-Горского лесничества ГЛХУ «Ивацевичский лесхоз» до юго-восточного угла квартала № 65 Бронно-Горского лесничества ГЛХУ «Ивацевичский лесхоз»;

***восточная:*** от юго-восточного угла квартала № 65 Бронно-Горского лесничества ГЛХУ «Ивацевичский лесхоз» по западным границам кварталов № 66, 83 Бронно-Горского лесничества ГЛХУ «Ивацевичский лесхоз» до населенного пункта Бронная Гора;

***южная:*** от населенного пункта Бронная Гора в западном направлении по северным границам кварталов № 121, 120, 136 Бронно-Горского лесничества ГЛХУ «Ивацевичский лесхоз» до юго-восточного угла квартала № 119 Бронно-Горского лесничества ГЛХУ «Ивацевичский лесхоз»;

***западная:*** от юго-восточного угла квартала № 119 Бронно-Горского лесничества ГЛХУ «Ивацевичский лесхоз» в северном направлении по восточным границам кварталов № 119, 102, 82, 64, 44 Бронно-Горского лесничества ГЛХУ «Ивацевичский лесхоз» до юго-западного угла квартала 45 Бронно-Горского лесничества ГЛХУ «Ивацевичский лесхоз».

В пределах участка, границы которого описаны выше, расположена воинская часть.

Сумма арендной платы за охотничьи угодья – 532,54 (пятьсот тридцать два белорусских рубля 54 копейки).

Претенденты на участие в конкурсе с объектом конкурса знакомятся самостоятельно.

**Условия конкурса на право заключения договора аренды охотничьих угодий:**

1. Опыт ведения охотничьего хозяйства не менее 10 лет, подтвержденный документально.
2. Обеспечение наличия штата егерской службы в соответствии с требованиями действующего законодательства на протяжении всего срока аренды охотничьих угодий.
3. Обеспечить в течение года с даты заключения договора аренды охотничьих угодий наличие на территории Березовского района материально-технической базы, включающей:

3.1. Базу для размещения охотников и их транспорта;

3.2. Вольеров для содержания охотничьих собак на территории базы;

3.3. Место пристрелки оружия и проведения соревнований по стрельбе из охотничьего оружия;

3.4. Автотранспортные, технические, моторные маломерные суда, для осуществления биотехнических и охотохозяйственных мероприятий, а также охраны охотничьих угодий.

4. В течение трех месяцев с даты заключения договора аренды охотничьих угодий оформить в установленном порядке земельный участок для утилизации трупов диких животных и в течение 6 месяцев устройство специального сооружения.
5. Обустроить в охотничьих угодьях в течение 1 года с момента заключения договора аренды охотничьих угодий:

5.1. Стоянку для охотников, с обязательным наличием на ней: кострища и места сбора мусора в пределах охотничьих угодий;

5.2. Подкормочные площадки для охотничьих животных и солонцов в соответствии с требованиями Инструкции о порядке проведения биотехнических мероприятий, утвержденной постановлением Министерства лесного хозяйства от 16.05.2014 года № 9 с изменениями и дополнениями.

6. Проведение мероприятий по охране и воспроизводству диких животных, сохранение среды их обитания, улучшению кормовых, гнездовых и защитных условий для диких животных, увеличению их численности.
7. Проведение мероприятий по предупреждению уничтожения или повреждения охотничьими животными лесных культур.
8. Участие в выполнении показателей Березовского района по туризму.
9. Установление в течение года с даты заключения договора аренды охотничьих угодий информационных указателей (аншлагов) согласно охотоустроительной документации с указанием наименований пользователя охотничьих угодий, охотхозяйственных зон, других единиц внутрихозяйственного деления территории, информации о режиме охоты на данной территории, контактных телефонов пользователя охотничьих угодий, а также обеспечение надлежащего содержания указателей и читаемости размещенной на них информации.

**Для участия в конкурсе в срок до 17.00 23 декабря 2019 г.** необходимо предоставить комиссии для организации и проведения торгов по предоставлению в аренду охотничьих угодий, по адресу: Брестская обл, г. Береза, ул. Красноармейская, 27, каб. 23А (с 8.00 до 13.00, с 14.00 до 17.00 по рабочим дням понедельник – пятница), документы, указанные в пункте 11 Положения о порядке проведения торгов по предоставлению в аренду охотничьих угодий, определения размеров платы за право заключения договора аренды и арендной платы за охотничьи угодья, утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 14 июня 2018 г. № 454.

Задаток вносится на отдельный расчетный счет Березовского районного исполнительного комитета р/с BY27AKBB36410013400151100000 в ЦБУ 106 ф-ла 113 ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY21113, УНП 200242668, в размере 20 (двадцати) процентов от суммы ежегодной арендной платы за охотничьи угодья в сумме 106,51 (сто шесть белорусских рублей 51 копейка).

Срок внесения задатка – при подаче документов.

Порядок внесения задатка – единовременно.

Кроме этого, участник, выигравший торги, в течение 10 дней с момента подписания протокола проведения торгов возмещает затраты на организацию и проведение торгов. Сумма затрат и порядок их возмещения доводятся до сведения участников торгов до начала их проведения в день проведения торгов.

Договор с победителем конкурса заключается Брестским областным исполнительным комитетом в сроки, установленные законодательством.

Секретарь комиссии находится по адресу: Брестская обл, г. Береза, ул. Красноармейская, 27, каб. 28. Контактный телефон секретаря комиссии – 8 (01643) 2-77-07.

**Комиссия для организации и проведения торгов по предоставлению в аренду охотничьих угодий.**

# Извещение о проведении аукциона

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б |
| **Продавец** | ЗАО «АТЛАНТ», г. Минск, пр-т Победителей, 61 |

**Предмет аукциона – Имущество, реализуемое одним лотом, в следующем составе:**

| Наименование, назначение | Общ. площадь | Инв. номер |
|---|---|---|
| **База РСУ** (здание специализированное иного назначения) | 2 714 кв. м | 110/С-107599 |
| **Составные части и принадлежности:** две пристройки. **Адрес:** Брестская обл., Барановичский р-н, Столовичский с/с, 213/1, База РСУ, 1,4 км севернее д. Антоново | | |
| **Склады РСУ** (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ) | 322,6 кв. м | 110/С-107598 |
| **Адрес:** Брестская обл., Барановичский р-н, Столовичский с/с, 213/2, склады РСУ, 1,4 км севернее д. Антоново | | |

**Сведения о земельном участке:** предоставлен на праве постоянного пользования общей площадью 0,7077 га для обслуживания базы РСУ и складов РСУ

| | |
|---|---|
| **Начальная цена с НДС 20 %** | **423 360,00 бел. руб.** |
| **Сумма задатка** | **30 000,00 бел. руб.** |

**Задаток** перечисляется на счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

